

«ГАРАЧАЕ СЭРЦА» ВАЛЯНЦІНЫ ЕРАНЬКОВАЙ 8

«ШТОНІКІ ДЛЯ СПЯШОНІКАЎ» 11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 СНЕЖНЯ 2022 г. СУБОТА № 238 (29860)

## КОРАТКА

• **Аляксандр Лукашэнка адобрыў выдзяленне больш як Br130 млн з рэзервовага фонду Прэзідэнта на падтрымку бюджэтнікаў.**

• Мінлясгас ставіць задачу максімальна хутка рэагаваць на заяўкі ад насельніцтва.

• **Выпускныя цэнтралізаваныя іспыты плануецца правесці 14 і 21 мая.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый МІЦКЕВІЧ, старшыня Беларускага рэспубліканскага саюза юрыстаў, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

*«Над рознымі дакументамі працуюць розныя спецыялісты, розная колькасць распрацоўшчыкаў. Прадстаўляючы законапраект для абмеркавання, напрыклад у сетцы Інтэрнэт (ёсць і іншыя спосабы і метады: дыялогавыя пляцоўкі, сустрэчы з працоўнымі калектывамі або актывам таго ці іншага рэгіёна), мы атрымліваем зваротную сувязь. Часта паступае вельмі шмат прапаноў, заўваг, якія абмяркоўваюцца, аналізуюцца. Нейкія праўкі ўносяцца. Гэта важна, калі людзі, якія не займаліся падрыхтоўкай законапраекта, збоку на яго паглядзяць, бачаць нейкія недакладнасці ці прапануюць больш дасканалыя фармулёўкі. На шчасце, у нас такіх прапаноў вельмі шмат па ўсіх законапраектах, асабліва па тых, якія закранаюць правы і інтарэсы людзей».*

З першых вуснаў

# «УСТУПНАЯ КАМПАНІЯ НЕ ПАВІННА БЫЦЬ ЛАТАРЭЯЙ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, прысвечаную ўдасканаленню ўступнай кампаніі ў ВНУ. Гэтая нарада — працяг размовы, пачатай сёлета ў жніўні. Тады ў ходзе абмеркаванняў кіраўнік дзяржавы паставіў Адміністрацыі Прэзідэнта і Міністэрству адукацыі адну канкрэтную задачу — дадаткова прапрацаваць выкладзеныя ў абноўленых Кодэксе аб адукацыі і Правілах прыёму падыходы да арганізацыі выніковай атэстацыі за курс сярэдняй школы і правядзення ўступнай кампаніі ў ВНУ.**



Фота БелТА.

Прэзідэнт паставіў пытанне, ці адпавядаюць гэтыя падыходы і ў якой меры ключавому патрабаванню — убачыць кожнага абітурыента. «Але пры гэтым яны павінны забяспечыць справядлівыя адносіны і стварыць роўныя магчымасці для атрымання адукацыі ў вышэйшых навучальных установах для ўсіх, хто паступае», — падкрэсліў ён.

Гэтыя месяцы Міністэрствам адукацыі і паралельна Адміністрацыяй Прэзідэнта праводзіліся грамадскія абмеркаванні, апытанне педагогаў, бацькоў, усіх зацікаўленых. «Вельмі важна, каб гэтае апытанне і яго вынікі не падганяліся пад вашу думку», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўніку дзяржавы далажылі, што работа была праведзена маштабная. Таму ён пацікавіўся гатоўнасцю сістэмы адукацыі, мясцовых органаў улады, ВНУ да новаўвядзенняў. Прэзідэнт запытаў, ці ўсё зроблена, каб запусціць новы механізм, як прадугледжвае Міністэрства адукацыі, з 2023 года, і ці ёсць нейкія праблемы. Але, па словах кіраўніка дзяржавы, больш за ўсё яго цікавіць, наколькі аптымальныя гэтыя падыходы ў бягучы момант, якія перавагі яны даюць сістэме адукацыі і краіне ў будучыні, ці не нясуць яны патэнцыйныя праблемы. Гэтыя пытанні Аляксандр Лукашэнка накіраваў кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта Ігару Сергеенку.

«Яшчэ раз звяртаю ўвагу прысутных, што ўзнятыя пытанні непасрэдна датычацца нашых людзей і мы не павінны сваімі рашэннямі нікога страціць ці, не дай бог, адштурхнуць. ***Наша задача як дзяржавы — забяспечыць, падкрэслю, нашай моладзі найбольш шырокія магчымасці для прафесійнага станаўлення і развіцця ў краіне. А пра тых, хто шукае сірочага хлеба за мяжой, нават казаць не варта. Пры гэтым уступная кампанія ў ВНУ не павінна быць латарэяй або ўдалым збегам абставін для асобных абітурыентаў»,*** — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён заклікаў удзельнікаў нарады выказвацца, калі ёсць нейкія сумненні ў прыманых рашэннях ці патэнцыйныя праблемы.

СТАР. 2

Зварот у рэдакцыю

# «Ну як гэта так — жыць у сваім доме і не выйсці на двор»

**Прыяцельцы нашай бабулі пашанцавала з суседзямі па лецішчы. Адны ўсе выхадныя напралёт гучна слухаюць музыку, другія — п'юць дзень з ноччу, а потым свараца на чым свет стаіць. Мая знаёмая з Мінска, якая знаходзіцца ў дэкрэтным адпачынку, кажа, што пасля таго, як атрымала доўгачаканую кватэру ў новабудоўлі, таксама забылася пра цішыню. У абед немагчыма дзіця ўкласці спаць з-за шуму перфаратараў ды дрыляў, таму даводзіцца гэта рабіць на вуліцы ў калясцы. Але ў параўнанні з праблемай сям'і Маліноўскіх, якая звярнулася да нас у рэдакцыю, вышэйзгаданыя могуць падацца проста кветачкамі.**

Алена Маліноўская разам з мужам жыве непадалёк ад Мінска ў аграгарадку Навaселле. У 2011 годзе праз дарогу ад іх участка, на тэрыторыі былой закінутай піларамы, пачалі вырабляць тратуарную плітку. «Шум і вібрацыя, якая сыходзіць ад гэтай вытворчасці, разбурае жыццё і здароўе мне, маім дзецям і ўнукам», — уздыхае Алена Іосіфаўна, якая 36 гадоў адпрацавала ў мясцовай школе настаўніцай.

СТАР. 5

Прыкметы часу

# «ПУХНАЦІКІ» Ў ГОРАДЗЕ

## На вуліцах і ў крамах з'явіўся навагодні антураж



Зайцы каля ўвахода ў ЦУМ.

**Здаецца, з кожным годам упрыгожваць сталіцу і абласныя цэнтры да Новага года пачынаюць усё раней і раней. Сёлета, вядома, сапраўдная снежная зіма прыйшла ў Беларусь яшчэ напрыканцы восені — рана, хутка і адразу. І ўсё ж шмат хто кажа, што з навагоднім афармленнем крам, вуліц і плошчаў можна было б крыху пачакаць.**

СТАР. 12

ISSN 1990 — 763X

22238

9 771990 763008

**Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.**



# «УСТУПНАЯ КАМПАНІЯ НЕ ПАВІННА БЫЦЬ ЛАТАРЭЯЙ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Часу ў нас не засталося. Тут і зараз нам трэба сфармуляваць механізм працы сферы адукацыі на перспектыву. ***Пастаянныя рэфармаванні і ўдасканаленні пасля сённяшняга абмеркавання павінны быць спынены!*** Акрамя падручнікаў, якія вы будзеце ўдасканальваць, рэфармаваць, новыя пісаць, старыя мадэрнізаваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, частыя змяненні ў сферы адукацыі ўжо абураюць людзей, таму пастаянна мяняць правілы гульні нельга. «Давайце, нарэшце, паставім кропку ў гэтай зацягнутай размове і будзем працаваць», — заклікаў Прэзідэнт.

### Убачыць абітурыента і не страціць таленты

Міністр адукацыі Андрэй Іванец у сваім дакладзе нагадаў, што кіраўнік дзяржавы паставіў тры задачы да правядзення будучых уступных кампаній. Першая — убачыць абітурыента. Другая — не страціць таленавітую моладзь. І трэцяя — спыніць беганіну паміж універсітэтамі. Міністр далажыў аб іх выкананні. «Убачыць абітурыента можна пры здачы ўнутранага экзамену і праходжання сумоўя. У будучую ўступную кампанію для абітурыентаў, якія будуць паступаць на мэтавую форму падрыхтоўкі, прадугледжана здача вуснага ўнутранага экзамену. Такім чынам, мы зможам убачыць будучых медыкаў, педагогаў, спецыялістаў, якія збіраюцца працаваць у сельскай гаспадарцы. Мяркуем, што такія падыходы дапамогуць нам у поўнай меры ўбачыць абітурыента», — сказаў ён.

Не страціць таленавітую моладзь, па словах Андрэя Іванца, дапамагае прыём у ВНУ без уступных экзаменаў пераможцаў рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд. «Дадзеную форму трэба пашыраць. У гэтым годзе прапануецца правядзенне ўніверсітэцкіх алімпіяд у рэгіянальных ВНУ, што дазволіць замацаваць і пакінуць таленавітую моладзь у рэгіёнах і падрыхтаваць кадры», — адзначыў міністр. Ён нагадаў, што з 1 студзеня 2021 года ў эксперыментальным фармаце працуе Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк. Для навучання ў ім дзеці праходзяць шматстадыйны адбор. Таму мяркуецца праз сумоўе прымаць у ВНУ па адпаведным профілі выпускнікоў дзіцячага тэхнапарка. Таксама праз сумоўе ва ўніверсітэты могуць паступіць выпускнікі педагагічных, аграрных і фізкультурных класаў.

### «Трэба быць набліжанымі да зямлі»

Актуальным з'яўляецца пытанне ўдасканалення падыходаў да правядзення ўступнай кампаніі. Гэта паказала і грамадскае абмеркаванне з усімі зацікаўленымі. Цяпер выпускнікам школ трэба будзе здаваць два цэнтралізаваныя экзамены: адзін — па рускай ці беларускай мове, другі — па прадмеце на выбар самога выпускніка. Для паступлення ў ВНУ неабходна будзе здаць і адно цэнтралізаванае тэсціраванне. Мяркуецца, што гэта дазволіць аб'ектыўна ацаніць веды навучэнцаў і дапаможа ім зрабіць больш усвядомлены выбар прафесіі. Прынцыповае адрозненне цэнтралізаванага экзамену ад звычайнага выпускнога іспыту ў школе заключаецца ў наступным: заданні ўніверсальныя для ўсіх, распрацоўваюцца Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў. Другое адрозненне — здача іспыту будзе праходзіць не ў школе. Праводзіць іспыты плануецца ў аўдыторыях каледжаў і ўніверсітэтаў. Ацэньваюцца работы ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў. Бланкі адказаў, як і пасля цэнтралізаванага тэсціравання, праверыць камп'ютар. Затым атрыманая адзнака з улікам гадавой выстаўляецца ў атэстат выпускніка.

Прэзідэнт на стаў аспрэчваць выказаныя прапановы. Але як кіраўнік дзяржавы паставіў пытанні па самых важных аспектах. Адзін з іх — форма здачы цэнтралізаванага экзамену. Прэзідэнт спытаў, як экзамен дапаможа ацаніць агульны ўзровень ведаў школьнікаў, калі кожны будзе здаваць іспыт па тым прадмеце, які ведае лепш за ўсе астатнія. «Так, нейкі ўзровень будзе. Мы школу падштурхнём. Але ў цэлым мы яго ведаць не будзем», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Спецыялісты падкрэслілі, што агульны ўзровень ведаў выпускнікоў дазволіць ацаніць сярэдні бал атэстата, гэты паказчык таксама будзе ўлічвацца пры паступленні.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, наколькі мэтазгодна праводзіць цэнтралізаваныя экзамены па-за межамі школ. З гэтага вынікае яшчэ адно важнае пытанне — у дзень экзамену многіх школьнікаў прыйдзецца везці ў іншыя раёны ці гарады. «Я не гатовы сказаць, што добра, калі дзеці з Крычава, якія здаюць школьныя экзамены, паедуць у Магілёў. Гэта неяк дзіўна. Няўжо мы ў раённым цэнтры не можам сабраць выпускнікоў і правесці экзамен? Каму мы там не давяраем?» — заўважыў ён. Андрэй Іванец расказаў, што ў краіне вызначаны 93 пункты для здачы цэнтралізаванага экзамену. Некаторыя з іх будуць дзейнічаць як міжраённыя. Па словах міністра, сёння каля 60 тысяч школьнікаў з сельскай мясцовасці знаходзяцца на падвозе, таму выезд на цэнтралізаваны іспыт дадатковага стрэсу не створыць.

***«Гэта павінна быць ідэалагічная кампанія. Чаму мы яе павінны з Дрыбіна забраць у Горкі, напрыклад? Што дрэннага ў тым, што вы нарэшце павылазіце з кабінетаў і пабудзеце на гэтым іспыце? Што за праблема пракантраляваць?*** Вы ўжо надумана, з такім недаверам да гэтага ставіцеся. Трэба нам сур'ёзна падумаць і не сеяць, груба кажучы, варожасць паміж людзьмі. ***Трэба адысці ад гэтай надуманасці і быць набліжанымі да зямлі.*** Падумайце. Я лічу, што іспыты мы павінны праводзіць у раённым цэнтры максімум, не вышэй», — сказаў Прэзідэнт.

### ❍ У тэму

**Маладыя людзі маюць роўныя магчымасці паступіць у ВНУ**

**Міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ** расказаў журналістам, што агучаныя на нарадзе прапановы былі выпрацаваны фактычна ўсёй краінай. Свае меркаванні выказвалі бацькі, якія найбольш перажываюць за сваіх дзяцей, настаўнікі і самі навучэнцы. Галоўнай мэтай гэтай работы Андрэй Іванец назваў стварэнне справядлівай сістэмы паступлення ва ўніверсітэты. «Маладыя людзі павінны разумець, што маюць роўныя магчымасці паступіць ва ўніверсітэт», — канстатаваў міністр.

Па словах Андрэя Іванца, важны фактар замацавання маладых людзей у рэгіёнах — падрыхтоўка студэнтаў па мэтавым наборы. Абітурыенты, якія паступаюць на такую форму навучання, будуць здаваць адзін унутраны экзамен у вуснай форме. Міністр падкрэсліў, што гэта дасць магчымасць лепш ацаніць узровень ведаў абітурыента і ўбачыць чалавека.

Усе навацыі будуць замацаваны ва Указе Прэзідэнта. Будуць дапрацаваны адпаведныя нормы, улічаны вынікі дыскусій на ўзроўні Прэзідэнта, прыняты да ўвагі вынікі грамадскіх абмеркаванняў. «Улічваючы змяненні, якія ўносяцца, было дадзена даручэнне апублікаваць у поўным аб'ёме ўказ. Каб не было ніякай блытаніны, каб і бацькі, і навучэнцы, і кіраўнікі ўніверсітэтаў поўнасцю разумелі ад пачатку да канца ўсю прыёмную кампанію», — адзначыў Андрэй Іванец.

Першы намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення па адукацыі Віцебскага аблвыканкама Алена Багдановіч расказала, што ў рэгіёне ўжо правялі пробны цэнтралізаваны экзамен для школьнікаў Гарадоцкага і Шумілінскага раёнаў. Лагістычныя пытанні былі вырашаны без праблем, школьнікі паказалі свае веды, а спецыялісты атрымалі аб'ектыўную карціну ведаў навучэнцаў. Яна звярнула ўвагу на яшчэ адну перавагу такога фармату. Раней школьнікі здавалі выпускныя экзамены ў школе, каб атрымаць атэстат, і цэнтралізаванае тэсціраванне, каб паступіць у ВНУ. Цэнтралізаваны экзамен аб'ядноўвае гэтыя два іспыты.

«Я спрабую ў цэлым, як дасведчаны чалавек, ацаніць усю гэтую кухню. Як гэта будзе ўспрынята бацькамі, вучнямі. Ці правільна мы зробім, што не ўзварушым дзяцей, як нас калісьці, па ўсіх прадметах, а па двух», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы даручыў узважыць усе «за» і «супраць», уважліва падысці да навацый і аформіць усе прапановы ў нарматыўны прававы акт. Ён запатрабаваў праінфармаваць яго, калі ў кагосьці ўзнікнуць новыя прапановы ці альтэрнатыўныя меркаванні.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Кропкі над «і»

# Дыстанцыйная адукацыя: для каго і на якіх умовах?

**Міністэрства адукацыі вызначыла патрабаванні да арганізацыі дыстанцыйнай адукацыі пры рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі (пастановы Міністэрства адукацыі № 430 і № 431).**

У прыватнасці, па шэрагу спецыяльнасцяў навучанне ў дыстанцыйнай форме не дапускаецца. Нельга, напрыклад, рыхтаваць дыстанцыйна педагогаў, медыкаў, спецыялістаў па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы, спецыялістаў у архітэктуры і будаўніцтве, горнай справе і гэтак далей.

Умовамі арганізацыі адукацыйнага працэсу на базе ўстановы вышэйшай адукацыі ў дыстанцыйным фармаце з'яўляюцца наяўнасць электронных адукацыйных рэсурсаў па вучэбных дысцыплінах, навучальных планаў спецыяльнасцяў, сістэмы электроннага навучання, якая ўключае праграмныя і тэхнічныя сродкі, электронныя адукацыйныя рэсурсы, што забяспечваюць засваенне студэнтамі адукацыйных праграм або іх частак, узаемадзеянне ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу, маніторынг і пратакаліраванне суб'ектамі адукацыйнага працэсу розных відаў вучэбнай дзейнасці, уключаючы рэгістрацыю лічбавага следу навучэнца, арганізацыю і правядзенне атэстацыі, рэгістрацыю лічбавага следу выкладчыка.

Электроннае адукацыйнае асяроддзе павінна ўключаць сістэму электроннага навучання, электронныя адукацыйныя рэсурсы, электронныя інфармацыйныя рэсурсы, асабісты кабінет студэнта, з дапамогай якога забяспечваецца абаронены персаналізаваны доступ у электроннае адукацыйнае асяроддзе.

Сучасныя тэхнічныя сродкі павінны ідэнтыфікаваць асобу студэнта, кантраляваць пастаянную яго прысутнасць у месцы праходжання атэстацыі, не дапусціць падмены студэнта іншай асобай, выяўляць і рэгістраваць магчымыя спробы парушэння ўстаноўленых правіл правядзення атэстацыі з боку студэнта і іншае.

Адукацыйны працэс ажыццяўляецца ў адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі спецыяльнасцяў і вучэбнымі планамі спецыяльнасцяў установы вышэйшай адукацыі, згодна з вучэбнымі праграмамі.

Пры атрыманні дыстанцыйнай адукацыі атэстацыя студэнтаў праводзіцца ў наступных фарматах: бягучая — як у вочным, так і дыстанцыйным; прамежкавая — у вочным фармаце па выніках усіх семестраў падчас лабараторна-экзаменацыйных сесій або ў камбінаваным фармаце (па выніках кожнага навучальнага года: за першы семестр навучальнага года — у дыстанцыйным фармаце з прымяненнем працэдуры вiктарыны па меры гатоўнасці навучэнца да атэстацыі, за другі семестр навучальнага года — у вочным фармаце падчас лабараторна-экзаменацыйнай сесіі ў канцы навучальнага года); выніковая — у вочным фармаце.

Пастановай Міністэрства адукацыі таксама ўрэгуляваны асноўныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі.

Педработнікі праводзяць вучэбныя заняткі з выкарыстаннем разнастайных форм, метадаў, прыёмаў і сродкаў, забяспечваюць ідэалагічны і выхаваўчы складнік навучальных заняткаў, узаемадзейнічаюць з навучэнцамі з выкарыстаннем дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій у адпаведнасці з зацверджанымі графікамі адукацыйнага працэсу, раскладамі навучальных заняткаў, графікамі кансультацый.

Правядзенне практыкі, вытворчага навучання ва ўстанове адукацыі магчымае з выкарыстаннем дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій у адпаведнасці з вучэбна-праграмнай дакументацыяй установы адукацыі. Аднак гэта не датычыцца вытворчай практыкі.

Таксама агаворваюцца пытанні бягучай, прамежкавай і выніковай атэстацыі навучэнцаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# АД МІЖНАРОДНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА ДА НАВУКІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў тэлефонную размову са сваім расійскім калегам Уладзімірам Пуціным. Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі парадак дня саміту Еўразійскага эканамічнага саюза, які адбудзецца ў Кыргызстане. Абмеркавалі міжнародны парадак дня і абстаноўку, каардынацыю сумесных дзеянняў. Абгаварылі таксама важныя пытанні двухбаковага ўзаемадзеяння — імпартазамяшчэнне, рэалізацыю саюзных праграм.**

Асобную ўвагу ўдзялілі супрацоўніцтву ў гуманітарнай сферы, у прыватнасці навуцы. Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін дамовіліся на працягу года на базе Акадэміі навук арганізаваць і правесці Кангрэс маладых вучоных Беларусі і Расіі ў развіццё нядаўняй сустрэчы Прэзідэнта Расіі з вучонымі ў «Сірыусе» і на базе напрацаванага ў Беларусі вопыту (напрыклад маштабны праект «100 ідэй для Беларусі»).

Прэзідэнты намецілі і графік далейшых кантактаў, дамовіўшыся правесці ў снежні сустрэчу для абмеркавання практычных пытанняў рэалізацыі саюзнага будаўніцтва і эканамічных пытанняў.

# «ЭКАНОМІКА — ПЕРШ ЗА ЎСЁ»

**Наталля КАЧАНАВА правяла нараду з кіраўнікамі адміністрацый раёнаў Мінска**

**У Савеце Рэспублікі на чале са Старшынёй Натальяй Качанавай адбылася нарада з кіраўнікамі адміністрацый раёнаў сталіцы. Асноўнай тэмай сустрэчы стала абмеркаванне выканання прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця:**

— Эканоміка — перш за ўсё: неабходна акцэнтаваць увагу на тых пытаннях, якія найбольш актуальныя на дадзены момант. Падчас правядзення пасяджэння выканкама мы абмяркоўвалі выкананне прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця — гэта першачарговая задача, — адзначыла Наталля Качанава.

Удзельнікамі нарады сталі кіраўнікі сталічных раёнаў і супрацоўнікі выканкамаў. Звяртаючыся да іх, Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла:

— Горад Мінск не можа быць апошнім па паказчыках валавога рэгіянальнага прадукту. Вы павінны наведаць усе прадпрыемствы, якія ў вас ёсць: сустрэцца з іх кіраўнікамі і абмеркаваць пытанні, выраўнаваць сітуацыю. Трэба кантраляваць сітуацыю з ВРП і паказчык па інвестыцыях. Спакой і згода ў нашай краіне залежаць у тым ліку і ад нас. Таму ўсё, што мы робім, павінна быць рэзультатыўным і эфектыўным.

Акрамя таго, Наталля Качанава скіравала ўвагу на тое, што не ўсе кіраўнікі сталічных прадпрыемстваў здольныя выканаць прагнозныя паказчыкі:

— У нас застаўся ўсяго месяц да падвядзення вынікаў і ацэньвання работы кіраўнікоў мясцовых органаў улады. Таму ўсе задачы, якія былі пастаўлены падчас пасяджэння выканкама, трэба рэалізаваць. Гэта архіважна. Паўтаруся, эканоміка — перш за ўсё. Мы павінны забяспечыць таварам не толькі сваю краіну, але і пастаўляць на экспарт, — акцэнтавала Старшыня Савета Рэспублікі.

**Арына КАРПОВІЧ.**

Заканадаўчыя навацыі

# ЖЫЦЦЁ БЕЗ БАР'ЕРАЎ

## Што зроблена для асабістай незалежнасці і самастойнасці людзей з інваліднасцю?

**Апошнім часам рэалізаваны шэраг праграм, накіраваных на паляпшэнне якасці жыцця інвалідаў і інтэграцыю іх у грамадства. Функцыянуюць установы рэабілітацыі, распрацоўваюцца і ўкараняюцца сучасныя тэхнічныя сродкі сацыяльнай рэабілітацыі, ствараецца безбар'ернае асяроддзе. Яшчэ адзін крок да паляпшэння якасці жыцця людзей з інваліднасцю — прыняцце Закона «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі», які ўступіць у сілу 6 студзеня 2023 года. Што зроблена для таго, каб гэтая катэгорыя грамадзян адчувала сябе больш камфортна ў грамадстве, расказала старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях Людміла КАНАНОВІЧ.**



***— Людміла Мікалаеўна, якіх навацый, замацаваных дакументам, чакалі людзі з інваліднасцю?***

— Адзначу, што работа па падрыхтоўцы законапраекта была вельмі сур'ёзная. З двух законаў, якія раней рэгулявалі адносіны людзей з інваліднасцю, атрымаўся адзін. Неабходна было ўлічыць ранейшыя нормы і гарантыі людзям з інваліднасцю, а таксама ўдасканаліць іх. У прыватнасці, дзяржавай створаны дадатковыя ўмовы для забеспячэння працаўладкавання дадзенай катэгорыі грамадзян. Гэта так званае квотаванне працоўных месцаў для прыёму на работу інвалідаў. Ліквідаваны бар'еры, якія перашкаджалі рэалізоўваць права на атрыманне адукацыі, — у заканадаўстве замацаваны паняцце інклюзіі ў адукацыі, а таксама абавязак забеспячэння ўстановамі адукацыі бесперашкоднага доступу для інвалідаў з парушэннямі апорна-рухальнага апарату, парушэннем слыху, зроку, інтэлектуальнымі парушэннямі. Акрамя таго, павышаецца якасць і эфектыўнасць правядзення рэабілітацыйных мерапрыемстваў. Аб'екты сацыяльнай, транспартнай і вытворчай інфраструктуры, а таксама жылыя памяшканні становяцца больш даступнымі для людзей з інваліднасцю.

***— Ці ўлічваліся пры распрацоўцы закона палажэнні Міжнароднай Канвенцыі аб правах інвалідаў?***

— Закон «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі» падрыхтаваны ў развіццё норм Канстытуцыі і Канвенцыі. Іх асноўныя палажэнні, у тым ліку тыя, якія датычацца правоў і свабод людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, знайшлі сваё адлюстраванне ў дакуменце. Нормы закона дапоўнены і з улікам прапаноў, якія паступалі ад людзей з інваліднасцю. Да ўнясення ў Палату прадстаўнікоў законапраект быў прадстаўлены для грамадскага абмеркавання. Любы чалавек мог азнаёміцца з ім на прававым партале і ўнесці пэўныя карэкціроўкі. Вядома, не ўсе прапановы былі ўлічаны. Найбольш слушныя з іх увайшлі ў дакумент. Устаноўлена, што інваліды валодаюць усімі грамадзянскімі, палітычнымі, эканамічнымі і іншымі правамі і свабодамі. Таксама адлюстраваны такія ключавыя правы, як права на недыскрымінацыю і абарону ад дыскрымінацыі па прыкмеце інваліднасці, самастойны лад жыцця і ўцягненасць у грамадскую дзейнасць, рэабілітацыю, абілітацыю, адукацыю, выбар роду дзейнасці і працаўладкаванне, даступнае асяроддзе. Уведзена забарона на дыскрымінацыю па прыкмеце інваліднасці, вызначана, якія выключэнні і абмежаванні не варта разглядаць як дыскрымінацыю. Гэтыя палажэнні павысяць прававую адукаванасць і абароненасць інвалідаў, а таксама дазволяць мінімізаваць злоўжыванні і парушэнні ў адносінах да людзей з інваліднасцю.

***— Кажучы пра інваліда, часцей за ўсё мы ўяўляем чалавека ў калясцы. Аднак людзі з інваліднасцю — больш шырокае паняцце. Што зроблена для таго, каб усе яны маглі камфортна сябе адчуваць у грамадстве?***

— Сапраўды, інваліды — не толькі тыя, хто перамяшчаюцца пры дапамозе каляскі. Ёсць інваліды і па зроку, і па слыху, з іншымі фізічнымі абмежаваннямі. У законе мы максімальна ўлічылі інтарэсы ўсіх. Асобныя яго палажэнні накіраваны на арганізацыю навакольнай прасторы, у якой людзі з інваліднасцю змогуць мець бесперашкодны доступ да паслуг, аб'ектаў, інфармацыі, магчымасць свабодна перамяшчацца па абраным маршруце. Напрыклад, да арганізацый, якія аказваюць паслугі насельніцтву, вызначана новае патрабаванне — сітуацыйная дапамога інвалідам ад работнікаў такіх арганізацый. Важны акцэнт у законе зроблены ў пытанні забеспячэння даступнасці для інвалідаў транспартнай інфраструктуры. Замацоўваецца абавязковасць па вылучэнні на ўсіх аўтамабільных паркоўках месцаў для стаянкі транспартных сродкаў інвалідаў, прадугледжваецца бясплатнае карыстанне інвалідамі аўтамабільнымі паркоўкамі.

***— Яшчэ адна навацыя — аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма па ўліку даступнасці аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры. Што яна будзе сабой уяўляць?***

— Гэта праект рэспубліканскага значэння, у рабоце якога будуць задзейнічаны дзяржаўныя органы і арганізацыі, якія аказваюць паслугі насельніцтву па ўсёй краіне. Актуальныя звесткі аб даступнасці аб'ектаў з інфармацыйнага рэсурсу будуць аўтаматычна перадавацца для размяшчэння на публічнай кадастравай карце ў інтэрнэце. Людзі з інваліднасцю, якія захочуць наведаць пэўны сацыяльны або прамысловы аб'ект, убачаць, наколькі ён даступны для іх. На гэтай карце будзе ўказана, ці ёсць у канкрэтным тэатры або краме пандус, поручань, ці абсталяваны там апазнавальныя знакі для людзей з парушэннем зроку, слыху і іншымі абмежаваннямі. У перспектыве гэта будзе своеасаблівы навігатар, які пракладзе шлях чалавеку з асаблівасцямі з аднаго пункта ў іншы. Плануецца, што інфармацыйная сістэма пачне функцыянаваць з 1 студзеня 2025 года.

***— У забеспячэнні безбар'ернага асяроддзя наша краіна значна прасунулася наперад...***

— І гэты рух пастаянны. Закрану толькі адзін момант. Людзі з інваліднасцю атрымлівалі жыллё і 20, і 30 гадоў таму. Калі параўнаць дамы, якія будаваліся ў той час і цяпер, — вялікая розніца. Вельмі важна, што цяпер, прымаючы новыя жылыя дамы, у камісію ўваходзяць і людзі з інваліднасцю, якія могуць сказаць, як павінна быць. Без элементаў даступнага асяроддзя аб'екты ўжо не здаюцца. А наколькі ўдасканаліліся сродкі рэабілітацыі? Паглядзіце, як пад патрэбы інвалідаў прыстасаваны транспарт. Раней такога не было. Многае зроблена для таго, каб аб'екты сацыяльнай інфраструктуры былі даступныя для ўсіх грамадзян. Дарэчы, мы сышлі ад паняцця «безбар'ернае асяроддзе». Цяпер мы кажам «даступнае асяроддзе». Любы пажылы чалавек мае патрэбу ў ім. Ён можа не мець інваліднасці, але яму 65+ і ёсць жаданне ўзяцца за поручань, каб не паслізнуцца і не ўпасці.

***— Паважлівае стаўленне да інвалідаў сёння ёсць, але праяўляецца яно не ў поўнай меры. Чаго, на ваш погляд, не хапае, каб людзі з інваліднасцю адчувалі сябе ў роўных умовах з іншымі?***

— Усё законамі не прапішаш. Ва ўзаемаадносінах з людзьмі з інваліднасцю вельмі важна не пераступіць мяжу ў той ці іншы бок. Калі адносіцца да гэтых людзей толькі з жалем, са спачуваннем, гэта не зусім добра. Наша задача — сацыялізаваць людзей з інваліднасцю ў грамадства, каб яны нароўні з намі маглі і працаваць, і атрымліваць адукацыю, і наведваць аб'екты, і выказваць сваю пазіцыю. З іншага боку, мы павінны сфарміраваць у грамадскасці разуменне таго, што ў людзей ёсць захворванне і па магчымасці трэба дапамагаць ім. Вельмі важна не ізаляваць інвалідаў. Дзеці з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі павінны вучыцца ў звычайных установах адукацыі. Для гэтага, вядома, павінны быць створаны ўмовы, што і робім. Мы ўжо з дзяцінства фарміруем у нашых дзяцей менталітэт, мысленне, што людзі з інваліднасцю — такія ж, як і мы ўсе.

**Вераніка КАНЮТА.**

Без абмежаванняў

# ВУЧЫЦЦА, ПРАЦАВАЦЬ І ЖЫЦЬ НА РОЎНЫХ

**Сёння адзначаецца Міжнародны дзень інваліда. У Беларусі жыве больш за 530 тысяч чалавек з інваліднасцю.**

**Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА** адзначыла, што дзяржава праводзіць сістэмную палітыку па падтрымцы і рэабілітацыі людзей з інваліднасцю.

— Больш за пяць гадоў таму наша краіна ратыфікавала Міжнародную канвенцыю аб правах інвалідаў. І ў дзяржаўнай палітыцы, і ў грамадскай свядомасці за гэты перыяд адбыліся зрухі ў рашэнні пытанняў інваліднасці. У першую чаргу варта сказаць, што сёння падтрымку інвалідаў мы разглядаем не толькі як матэрыяльную, але і як неабходнасць стварэння інклюзіўнага ўніверсальнага асяроддзя, дзе кожны чалавек з інваліднасцю мог бы рэалізаваць свой патэнцыял, — звярнула ўвагу намеснік міністра.

Інвалідам у нашай краіне аказваецца чатыры віды матэрыяльнай падтрымкі: пенсіі, дапамогі, санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне, а таксама сацыяльная дапамога на набыццё сродкаў гігіены (у рамках сістэмы адраснай сацыяльнай дапамогі). За 2021 год і дзевяць месяцаў 2022-га на гэтыя мэты накіравана каля шасці мільярдаў рублёў.

На рэалізацыю дзяржпраграмы «Сацыяльная абарона» на працягу пяці гадоў прадугледжана больш за чатыры мільярды рублёў. Яна ўключае раздзелы па сацыяльным абслугоўванні і сацыяльнай падтрымцы і арганізацыю даступнага асяроддзя.

Да 2025 года мяркуецца зрабіць цалкам даступнымі каля васьмі тысяч аб'ектаў. Варта адзначыць, што сёння ў краіне даступнымі з'яўляюцца каля 18 % аб'ектаў. З 2025 года запрацуе аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма па даступнасці аб'ектаў, своеасаблівы маршрутны гід для асоб з інваліднасцю.

### Заработная плата — да 1800 рублёў

Амаль палова інвалідаў у Беларусі — людзі працаздольнага ўзросту. З іх каля 120 тысяч маюць паказанні да працы, працуе пры гэтым каля 60 % (66 тысяч чалавек).

— Мы разумеем, што людзям з інваліднасцю няпроста канкураваць на рынку працы. Таму для прадпрыемстваў, якія прымаюць інвалідаў, прымяняюць розныя прэферэнцыі. Закон прадугледжвае такі інавацыйны механізм, як квотаванне працоўных месцаў для людзей з інваліднасцю. Ён атрымае сваё далейшае развіццё ў межах Закона «Аб занятасці», які пачне функцыянаваць з 2025 года. Акрамя таго, з году да двух павялічаны тэрмін адаптацыі да працоўнай дзейнасці для інвалідаў з інтэлектуальнымі парушэннямі.

Пра занятасць людзей з інваліднасцю расказаў **старшыня цэнтральнага праўлення Беларускага таварыства глухіх Сяргей СКУРАНОВІЧ.** Ён удакладніў, што таварыства мае дзевяць прадпрыемстваў — у Мінску і ўсіх абласных цэнтрах, а таксама ў Бабруйску, Оршы, Баранавічах і Барысаве. Там працуе амаль тры тысячы чалавек. З іх 58 % — інваліды. Гэта прадпрыемствы ў сферы машынабудавання, металаапрацоўкі, дрэваапрацоўкі, лёгкай прамысловасці.

— Усе люстэркі, якія ўстанаўліваюцца на МАЗы, МТЗ, расійскія КАМАЗы, — нашай вытворчасці. Многія ранейшыя сувязі парваліся, але знаходзім новыя рынкі збыту, лагістычныя шляхі. У нас няма ніводнага стратнага прадпрыемства. Сярэдні заробак — тысяча рублёў, няшмат, але, улічваючы той факт, што большасць людзей з інваліднасцю не маюць кваліфікацыі, гэта нядрэнная лічба. Максімальны заробак — 1800 рублёў, — расказаў Сяргей Скурановіч.

Новы закон прадугледжвае і далейшае развіццё сістэмы сацыяльнага абслугоўвання. Адна з форм, характэрная толькі для нашага заканадаўства, — замяшчальная сям'я. Гэта сумеснае пражыванне і вядзенне хатняй гаспадаркі. У Беларусі ўжо 150 замяшчальных сем'яў, дзе ажыццяўляецца догляд інвалідаў 1-й групы.

Уводзіцца і паслуга персанальнага асістэнта. Ён будзе суправаджаць чалавека з інваліднасцю ў паліклініку, службу занятасці, дапамагаць са складаннем дакументаў, рэзюмэ.

### Не — падвоеным стандартам

— Дзяржава планамерна рухаецца ў рэалізацыі палажэнняў Канвенцыі ААН аб правах інвалідаў. Аднак трэба адзначыць, што сама сусветная супольнасць не прытрымліваецца палажэнняў дадзенай канвенцыі. Чарговым крокам дыскрэдытацыі ў адносінах нормаў канвенцыі з'яўляецца рашэнне Міжнароднага паралімпійскага камітэта аб выключэнні з арганізацыі Беларусі. У канвенцыі не можа быць падвоеных стандартаў, таму Міністэрства працы і сацыяльнай абароны аб'явіла рэспубліканскую акцыю «Не — падвойным стандартам Канвенцыі аб правах інвалідаў». Мы запрашаем усіх нераўнадушных далучыцца да акцыі ў знак кансалідацыі і салідарнасці з людзьмі з інваліднасцю і выказаць нашу падтрымку спартсменам-паралімпійцам, — падкрэсліла Марына Арцёменка.

### Не шкадаваць, а навучаць

Як адзначыла **галоўны спецыяліст упраўлення дашкольнай адукацыі Міністэрства адукацыі Алена МУЛІЦА,** у банку даных маюцца звесткі аб 176,3 тысячы дзяцей да 18 гадоў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, з іх 14,7 тысячы маюць інваліднасць. Доля дзяцей з асаблівасцямі складае 9,5 %. Адукацыю яны атрымліваюць як у спецыялізаваных установах, так і ў звычайных садках і школах.

У Беларусі працуе 237 спецыялізаваных устаноў адукацыі, у тым ліку па 48 дзіцячых садкоў і школ, 141 карэкцыйна-развіццёвы цэнтр. Больш за 70 % дзяцей з асаблівасцямі вучацца ў звычайных школах у інтэграваных класах.

**Алена КРАВЕЦ.**

Тры пытанні да ўлады

# Багатыя гісторыяй

### Старшыня Мсціслаўскага райвыканкама пра тое, чым можа быць цікавы горад для жыхароў краіны і замежнікаў



**Турызм, бізнес, адпачынак — Мсціслаў той самы горад, дзе для гэтага ўсё ёсць. Гэта горад мінулага і сучаснага, духоўнага і свецкага, еўрапейскага і ўсходняга. Невыпадкова адным з напрамкаў развіцця раёна тут бачаць папулярызацыю горада як турыстычнай Меккі. На яго тэрыторыі размешчана 22 помнікі архітэктуры і 56 — археалогіі. Гісторыя Мсціслава багатая таямніцамі і легендамі. У вёсцы Басценавічы захаваўся старадаўні абрад — Варварынская свечка, адзін з унікальных аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. «Наша задача — захаваць цікавосткі і зрабіць іх знакавымі для жыхароў горада і краіны», — адзначае старшыня Мсціслаўскага райвыканкама Дзмітрый ПІМАШЭНКА.**

— Летась мы прынялі канцэпцыю развіцця турыстычнай сферы, у якую ўвайшлі цікавыя мерапрыемствы, — паведамляе ён. — Так, напрыклад, гістарычныя помнікі сёлета набылі QR-коды, па якіх з дапамогай тэлефона можна даведацца, чым знакамітыя тыя ці іншыя будынкі і аб'екты. Не ўсе ведаюць, што Мсціслаў — месца, дзе адначасова можна пабываць у дзвюх еўрапейскіх сталіцах — Парыжы і Лондане. Адпаведныя будынкі — своеасаблівыя візітоўкі горада.

Як і сакральнае месца — Пустынскі мужчынскі манастыр, у адным з пакояў якога праявіўся лік Хрыста. Наш Ануфрыеўскі манастыр таксама вельмі цікавы для наведвання.

Робім стаўку на развіццё падзейнага турызму, шмат хто ведае нас па сярэднявечным рыцарскім фэсце, які сёлета наведала больш за 15 тысяч гасцей.

З развіццём турызму звязваем і развіццё эканомікі, бо кожны чалавек, які прыедзе ў наш раён, падтрымае рублём нашы аграсядзібы, рамеснікаў. На тэрыторыі Мсціслаўшчыны знаходзяцца пяць аграсядзіб, сярод якіх вылучаюцца гасцявыя дамы з гастранамічнымі кірункамі. Некаторыя спецыялізуюцца на турах выхаднога дня, займаюцца арганізацыяй рыбнай лоўлі.

Некалькі гадоў таму да паслуг гасцей горада была адрамантаваная гасцініца.

Культурную праграму знаходжання ў Мсціславе можна разбавіць спартыўнай. Для гэтага існуюць спартыўная зала, летам запрашаем ацаніць міні-футбольную пляцоўку са штучным пакрыццём, якую адкрылі сёлета. У раёне шмат увагі ўдзяляецца захаванню памяці герояў Вялікай Айчыннай вайны. Сёлета метадам народнай будоўлі наводзілі парадак на Кургане Славы. Налета збіраемся цалкам завяршыць работы па яго добраўпарадкаванні.

***— З чым яшчэ звязваеце развіццё раёна?***

— Са стварэннем умоў для прадпрымальнікаў, прыватнай ініцыятывай. На працягу пяці гадоў у нас ажыццяўляе сваю дзейнасць прыватнае прадпрыемства Мсціслаўская швейная фабрыка, заснавальнік якой — Пачынкаўская швейная фабрыка са Смаленска. Сёння тут працуе болей чым 200 чалавек, трынаццаць працоўных месцаў было створана сёлета. Прадпрыемства займаецца пашывам спецадзення. Паспяховым можна лічыць і прадпрыемства «Агратэх-Усход», якое таксама створана з удзелам расійскага капіталу. У 2019 годзе, калі яно было заснавана, прадпрыемства апрацоўвала болей чым дзве тысячы гектараў зямлі, на сёння за ім замацавана 4,5 тысячы гектараў сельгасугоддзяў.

***— Меліярацыя, урадлівасць зямель — сёлета кіраўнік краіны акцэнтаваў увагу менавіта на такіх кірунках. Што дзеля гэтага робіцца ў раёне?***

— Меліярацыяй і ўцягненнем у севазварот нявыкарыстаных зямель у нас паспяхова займаецца «ПМК-94 Водбуд». Прычым не толькі на тэрыторыі Мсціслаўскага, Чэрыкаўскага і Крычаўскага рэгіёнаў, якія абслугоўвае, але і Горацкага і нават Шклоўскага. Сёлета яно перавыканала заданне, зрабіла гэтых работ болей чым на 1,8 мільёна рублёў. Толькі на тэрыторыі таварыства «Мазалаўскае» было ўведзена ў севазварот 110 гектараў новых зямель. Больш чым 170 аднаўленых, прадукцыйных гектараў зямлі атрымаў і «Мсціслаўскі райаграпрамтэхзаб». Паляпшэнне зямлі — яшчэ для дзвюх гаспадарак — «Сож-Агра» і «Кастрычнік». Толькі па першай будзе меліяравана 200 гектараў зямлі.

Хачу таксама адзначыць, што раён шмат працуе над паляпшэннем узроўню жыцця насельніцтва. Сёлета пасля капітальнага рамонту з мадэрнізацыяй была адкрыта дзіцячае аддзяленне бальніцы. Летась пасля рамонту адкрылася паліклініка. Як ужо казаў, сёлета ў горадзе з'явілася міні-футбольная пляцоўка са штучным пакрыццём, зараз робім хакейную каробку для зімовага адпачынку. Актыўна рыхтуемся да сустрэчы Новага года. Нашы арганізацыі і жыхары па традыцыі спаборнічаюць у конкурсе на найлепшае ўпрыгожванне. Для дзяцей і іх бацькоў на тэрыторыі ўстановы пазашкольнай работы будзе адкрыта рэзідэнцыя Дзеда Мароза. Гэта месца стане цікавым для адпачынку як жыхароў горада, так і яго гасцей.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

*г. Мсціслаў.*

Інклюзіў

# ПРАВА НА ПРАЦУ

### У Гродзенскай вобласці працоўныя рэкамендацыі маюць 13 тысяч чалавек з інваліднасцю, з іх больш за палову працаўладкаваны

**Многія арганізацыі гатовы даць рабочыя месцы для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Для такіх ствараюцца вакансіі і набываецца спецыяльнае абсталяванне за кошт бюджэтных сродкаў. Каб дапамагчы хутчэй адаптавацца ў прафесіі, дзейнічаюць індывідуальныя праграмы рэабілітацыі, сфарміраваныя медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіяй. Пры гэтым нормы па сацыяльнай падтрымцы пастаянна ўдасканальваюцца.**

## ДЗЯРЖАВА ГАРАНТУЕ...

Людзям з інваліднасцю гарантавана падтрымка дзяржавы. Палітыка краіны скіравана на тое, каб як мага больш чалавек працаўладкаваць. З'явілася такое паняцце, як квота для прыёму на працу інвалідаў. Яе рэгламентуе Закон «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі», прыняты летам гэтага года. Асноўная яго частка ўступіла ў сілу сёлета, некаторыя нормы пачнуць дзейнічаць у будучым годзе і пазней. Механізм будзе вызначацца ў Законе аб занятасці насельніцтва і адпаведнай пастанове ўрада. Мяркуецца, што на прадпрыемстве ці ўстанове, у залежнасці ад агульнага спіса работнікаў, павінен быць пэўны працэнт людзей з інваліднасцю. Гэта значна пашырыць магчымасць працаўладкавання інвалідаў, лічыць **начальнік упраўлення дзяржаўнай службы занятасці насельніцтва Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр СОБАЛЬ.** У вобласці нямала прадпрыемстваў, дзе працуюць людзі з інваліднасцю. Прычым большасць — у звычайных арганізацыях і толькі 12 працэнтаў — на спецыялізаваных прадпрыемствах.

маюць працоўныя рэкамендацыі медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій на той ці іншы від дзейнасці. Зыходзячы з гэтых рэкамендацый, супрацоўнікі службаў занятасці рэгіёна вызначаюць, чым можна дапамагчы чалавеку з абмежаванымі магчымасцямі.

— Для людзей з інваліднасцю прапануюцца тыя ж меры садзейнічання, што і кожнаму, хто зарэгістраваны ў якасці беспрацоўнага. Кансультацыя, садзейнічанне ў працаўладкаванні, а пры неабходнасці — накіраванне на прафесійнае навучанне. Для арганізацыі самазанятасці ёсць магчымасць атрымаць фінансавую падтрымку. Разам з тым для дадзенай катэгорыі прадугледжаны і спецыяльныя меры. Гэта, у першую чаргу, арганізацыя адаптацыі інвалідаў да працоўнай дзейнасці, стварэнне новых працоўных месцаў для гэтай катэгорыі грамадзян, устаноўка броні, — паведаміў Аляксандр Собаль.

За гэты год у абласны камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне паступіла звыш 1300 праграм рэабілітацыі, выдадзеных медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіяй. Амаль 320 чалавек, гатовых скарыстацца такой магчымасцю, звярнуліся ў службу занятасці.



Фота grodnonews.by

Гродзенцу Алегу Барадзіну 32 гады, ён інвалід другой групы з дзяцінства. Пасля трохгадовага перапынку пачаў працаваць спецыялістам па продажы на прадпрыемстве «ІнваШанц» ГА «БелТІ». Уладкаваны сюды ў рамках праграмы адаптацыі, якая разлічана на цэлы год. Зараз у яго гадавы кантракт з вызначаным акладам. Падтрымку ён адчуў і падчас звароту ў службу занятасці.

— Вельмі ўдзячны калектыву за дапамогу. Пытанні, якія ўзнікаюць падчас работы, хутка вырашаюцца. Можна сказаць, што псіхалагічна ўжо адаптаваўся, што таксама для чалавека з інваліднасцю вельмі важна, — кажа Алег.

Мужчына пакуль халасты, хоць не супраць завесці сям'ю. Але мяркуе, што напачатку трэба стаць на ногі, уладкавацца ў прафесіі, каб мець больш трывалы фінансавы фундамент, а не толькі пенсію па інваліднасці.

## КОЖНЫ АТРЫМАЕ ДАПАМОГУ

У Гродзенскай вобласці пражывае 22 тысячы інвалідаў працаздольнага ўзросту. З іх каля 13 тысяч чалавек

Пераважная большасць адрасатаў пакуль не вызначылася з перспектывамі працаўладкавання.

Служба занятасці прапануе індывідуальнае суправаджэнне беспрацоўных інвалідаў да наймальніка. У гэтым выпадку супрацоўнік службы занятасці ідзе на сумоўе разам з падапечным. Такім чынам было ўладкавана больш за 20 чалавек. Часам беспрацоўныя з абмежаванымі магчымасцямі не жадаюць акцэнтаваць увагу на інваліднасці і шукаюць працу самастойна.

## СТЫМУЛ ДЛЯ НАЙМАЛЬНІКА

Пры прыёме на працу інвалідаў актыўна выкарыстоўваецца механізм фінансавага стымулявання наймальнікаў. У шэрагу прэферэнцый — кампенсацыя затрат пры адаптацыі людзей з інваліднасцю. Гэты перыяд можа доўжыцца да года. Чалавек уцягваецца ў працу, атрымлівае зарплату, а ўсе выдаткі на яго прадпрыемству кампенсуе дзяржава. З пачатку года ў рамках адаптацыі працоўнай дзейнасці ў 64 арганізацыях было працаўладкавана 89 інвалідаў, расходы на кампенсацыю за гэты час склалі больш за 460 тысяч рублёў.

Такі ж падыход ажыццяўляецца і пры стварэнні працоўных месцаў для інвалідаў. У некаторых выпадках пад новыя вакансіі набываецца спецыяльнае абсталяванне, выдаткі на яго таксама бярэ на сябе дзяржава. Сёлета, напрыклад, расходы на новыя працоўныя месцы па дзвюх арганізацыях склалі 1 мільён 140 тысяч рублёў. У прыватнасці, набыта машына сухой чысткі адзення для пральні, а працоўнае месца створана спецыяльна для чалавека з інваліднасцю. Для прадпрыемства гэта вельмі важкая падтрымка. Галоўнае — знайсці сродкі для закупкі, якія будуць кампенсаваны. А для прадпрыемстваў таварыства інвалідаў сродкі выдзяляюцца адразу пад закупкі абсталявання.

— Палітыка дзяржавы накіравана на тое, каб не дапусціць дыскрымінацыі грамадзян з інваліднасцю ў сферы працоўных адносін. Чалавек з інваліднасцю можа прэтэндаваць на любую вакансію, калі валодае неабходнымі прафесійнымі кампетэнцыямі і не мае абмежаванняў па індывідуальнай праграме рэабілітацыі. Прыемна, што з кожным годам колькасць працаўладкаваных інвалідаў расце, — канстатуе Аляксандр Собаль.

У рэгіёне да канца года плануецца стварыць 23 працоўныя месцы для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, на наймальнікаў будзе выдаткавана з гэтай мэтай звыш трох мільёнаў рублёў. Большая частка адрасуецца прадпрыемству «Медватфарм», дзе мяркуецца ўладкаваць 14 чалавек. Таксама будуць створаны працоўныя месцы на прадпрыемствах таварыства інвалідаў.

## ЗАПАТРАБАВАНЫЯ ПРАФЕСІІ

У абласным камітэце па працы вызначылі партрэт працаздольнага гродзенца з інваліднасцю. Гэта мужчына 45 гадоў з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, які мае трэцюю групу інваліднасці з лёгкай стратай працаздольнасці. У агульнай колькасці беспрацоўных у рэгіёне людзі з інваліднасцю займаюць чатыры працэнты.

Штогод прадстаўнікі гэтай катэгорыі праходзяць навучанне па запатрабаваных на рынку працы прафесіях. Летась на навучанне было накіравана 22 беспрацоўныя інваліды, сёлета — 13. Служба занятасці аказвае фінансавую падтрымку тым, хто абраў самастойную занятасць. За мінулы і сёлетні год субсідыі для арганізацыі прадпрымальніцкай і рамеснай дзейнасці атрымалі 11 чалавек з абмежаванымі магчымасцямі. Як правіла, людзей з інваліднасцю цікавіць арганізацыя работы ў бытавой сферы: на рынку цырульніцкіх і фотапаслуг, тэхнічнага абслугоўвання і рамонту аўтамабіляў, санітарна-тэхнічных работ. Сёлета шэсць чалавек прайшлі навучанне ліфцёрамі з гарантаваным працаўладкаваннем. У ліку самых запатрабаваных прафесій сярод інвалідаў можна назваць укладчыка-ўпакоўшчыка, адміністратара, прадаўца-кансультанта, вадзіцеля, падсобнага рабочага, сартавальніка другаснай сыравіны, слесара-рамонтніка і іншых.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# «...Жыць у сваім доме і не выйсці на двор»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Бацькі жывуць тут больш за 40 гадоў, і апошнія 11 з іх ім няма жыцця ва ўласным доме, — дадае яе дачка Іна. — Ды і я не магу пакінуць дзіця ў бабулі і дзядулі летам на канікулах, бо кожная раніца пачынаецца з таго, што ўсе прачынаюцца пад страшэнны гук, ад якога нідзе не схаваешся. Мама мае 1-ю групу інваліднасці, пасля перанесенага інсульту апошнія тры гады наогул не выходзіць на вуліцу, пакуль працуе вытворчасць. Акрамя таго, разбураецца падмурак і трэскаюцца сцены дома. Гараж цэментам увесь замазаны ўжо, бо ідзе такая моцная вібрацыя».

| **Дата и время проведения торгов** | **16 декабря 2022 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **С 10.00 05 декабря 2022 года до 16.00 14 декабря 2022 года** |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901** Задаток для участия в торгах по Лоту ___, ОАО «Лепельпромшвеймебель», проводимых 16.12.2022.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Чеслав, +375299999112. Дополнительная информация по предмету торгов по тел. +375293058650, Алена.**

8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Лепельпромшвеймебель» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: 8 (017) 395-89-17, 8 (029) 392-89-06; e-mail: info.au@tut.by (211180, Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Володарского, д. 1, УНП 300038815)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

## Валянціна ЕРАНЬКОВА:

# «У маёй прафесіі ўсё магчыма, але недапушчальна абыякавасць»

**ВАЛЯНЦІНА Еранькова належыць да тых творцаў, што імкнуцца гаварыць пра важныя і жыццесцвярджальныя рэчы. Не стараецца падабацца ўсім, але ведае сабе цану і гатовая змагацца за свае перакананні. Рэжысёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Максіма Горкага Валянціна Еранькова сёння вядомая гледачам па дзясятках пастановак, дзе і руская, і беларуская, і замежная класіка. Аднак, нягледзячы на гады ў прафесіі, яна па-ранейшаму любіць яе, жыве ў імя тэатральнага мастацтва і верыць, што яно зможа яшчэ доўга ачышчаць душы людзей.**



### «ГАРАЧАЕ СЭРЦА»

***— Валянціна Рыгораўна, сёлета вашай пастаноўкай п'есы Астроўскага «Гарачае сэрца» адкрыўся 103-і сезон у Купалаўскім тэатры. Як выбіралі твор, расстаўлялі акцэнты і ці ўсё атрымалася, як хацелі?***

— У Купалаўскі тэатр я была запрошана па рэкамендацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Я прапанавала тэатру на выбар некалькі п'ес, але ў выніку ўзяліся за працу над п'есай Астроўскага. Ведаю, ёсць рэжысёры, якія не бяруцца за пастаноўку нейкага матэрыялу проста з пазіцыі «не мой аўтар», але я заўсёды для сябе шукаю кропкі супадзення з творам. І хоць п'еса, лічу, адна з самых складаных у творчасці Астроўскага і яе па-рознаму ўспрымаюць і ацэньваюць, не скажу, быццам адразу загарэлася матэрыялам. Але пачала хадзіць на спектаклі ў Купалаўскі, знаёміцца з трупай, весці папярэднюю працу над п'есай і разважаць над будучымі мізансцэнамі. Так, паступова і з'явіўся ў маёй душы водгук на гэту п'есу. А там ужо пачаў складвацца наш творчы ансамбль з акцёрамі, пастановачнай групай. І сёння па аншлагах на спектаклі мы бачым, што прымаюць нашу працу добра. Значыць, ёсць вынік. Прычым зараз тое адчуваецца ўжо не толькі па рэакцыі аўдыторыі, але і па атмасферы жыцця акцёраў у спектаклі. Яны спрацаваліся.

А спектакль — гэта ж жывы працэс, таму сёння можа атрымацца лепш, заўтра з пагрэшнасцямі, аднак тое ўжо не настолькі істотна, калі бачыш, як мяняюцца інтанацыі акцёраў, як яны пражываюць тэкст і на сцэне арганічна «падхопліваюць» адно аднаго. Яны адчуваюць залу, паглыбляюцца ў матэрыял, а ў адказ гледачы дзякуюць сваёй любоўю і апладысментамі.



***— Па ўласным знаёмстве з п'есай магу сказаць, што яна даследуе чалавечую сутнасць: на што мы гатовыя дзеля свабоды, поспеху, кахання і шчасця. Як рэжысёр, на чым вы засяроджваліся ў працы?***

— Па-першае, я чарговы раз пераканалася, якія падобныя па псіхалогіі і меладычнасці нашы мовы: руская і беларуская. Маё сутыкненне як рэжысёра з беларускай мовай адбылося яшчэ пры Барысе Луцэнку, з якім мы працавалі ў «Раскіданым гняздзе». Гэта была мая любімая пастаноўка. А пасля я ўжо самастойна працавала над спектаклем «Пясняр», дзе мела магчымасць яшчэ раз ушчыльную паглыбіцца ў беларускую драматургію. Увогуле, маючы беларускія карані, хоць я і расла, і жыла пэўны час ва Украіне, вельмі люблю беларускую мову. У мяне мама была настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. І я часта прасіла яе пачытаць мне што-небудзь па-беларуску. З яе вуснаў чула Якуба Коласа, Янку Купалу, урыўкі з твораў якіх маці магла пераказваць на памяць. Таму пры пастаноўцы «Гарачага сэрца» з задавальненнем адчула сябе ў стыхіі мовы.

А калі ўжо сталі працаваць над спектаклем, то мне, безумоўна, вельмі дапамог кампазітар спектакля Аляксей Еранькоў, які добра размаўляе па-беларуску. Мне было вельмі важна, каб мы не адыходзілі ад аўтарскага тэксту, нават калі ён у перакладзе. Для мяне як для рэжысёра заўсёды мае значэнне кожнае слова... І ў акцёрскай працы тэкст павінен быць на першым месцы. Трэба ўмець расшчапіць яго, працаваць з ім. Радасна, што ў Купалаўскім тэатры шмат маладых акцёраў, якія вельмі трапятліва ставяцца да мовы. Яны ў тым ліку сачылі, каб мы злавілі нейкія моўныя нюансы ў перакладным тэксце. Праца вялася вельмі грунтоўная. У некаторых момантах з акцёрамі пачынала з азоў, што забірала шмат часу. Але галоўнае, што ў іх я бачыла жаданне ствараць, спасцігаць новае ў сваёй прафесіі. Іх агонь у сэрцах і ў вачах і наша вялікая сумесная праца далі добры вынік, бо ў маёй прафесіі ўсё магчыма, але недапушчальна абыякавасць. А ў астатнім — я ў тым узросце і з тым багажом, што мне ўжо не трэба заваёўваць нейкае месца на тэрыторыі беларускага тэатральнага мастацтва.

### «ПЯСНЯР»

***— Глядзіце, калі п'еса Астроўскага — гэта магчымасць даследаваць прыроду чалавека, то ваш спектакль «Пясняр» у Горкаўскім тэатры ўздымае тэму творчасці і пошуку сябе ў ёй. Наколькі гэтая праца для вас знакавая і дарагая?***

— Усе мы ў свой час захапляліся «Песнярамі». Калі асэнсоўвала драматургічны матэрыял праз гісторыю гэтага славутага калектыву, праз іх музычную творчасць, то адкрывала найперш у самой сабе нязведаныя пачуцці, рэфлексавала эмацыянальна, і хацелася назапашанай энергіяй падзяліцца. У працэсе падрыхтоўкі давялося пазнаёміцца з многімі цікавымі людзьмі, даведацца пра адметныя падзеі з жыцця ансамбля. Плюс я прасякнулася беларускай мовай, гісторыяй, літаратурай. «Песняры» — сузор'е ўнікальных галасоў. Дзякуючы ім, ва ўсім свеце чулі беларускую мову і творы нашых класікаў літаратуры. І памяць пра «Песняроў» мы павінны захоўваць. Думаю, не памылюся, калі скажу, што ў гэтым спектаклі мы ўсе працуем ва ўнісон. Яго любяць і акцёры, і аўдыторыя.

***— А як вы ставіцеся да ацэнкі ўласнай творчасці?***

— Мы ўсе жывыя людзі. Кожны спектакль, які ствараеш, — нібы нараджэнне дзіцяці. Безумоўна, бацькам заўсёды важна і тое, як і што пра іх дзяцей скажуць. Так і са спектаклямі. Рэагуеш, перажываеш за будучае існаванне. Аднак з узростам я ўжо звяртаю ўвагу на ацэнкі, водгукі, нейкія прапановы ў асноўным тады, калі разумею, што чалавек правільна іх агучвае. З вопытам даведваешся цану і людзям, і іх выказванням. Для мяне вельмі важны пасыл у ацэнцы. Напрыклад, я дагэтуль, як і ўсе мае калегі, вельмі рэагую на людзей, якія сыходзяць падчас спектакля. Гэта ж элементарная культура паводзін! Калі нешта не спадабалася, то дачакайцеся антракту. Бо на сцэне працуюць жывыя людзі, якія часам выходзяць туды, нават калі ў іх гора ці дрэннае самаадчуванне, але яны ідуць, каб аддаваць гледачу свае сілы і сэрцы. Гэта варта помніць і паважаць!



***— Для вас мае значэнне, у якім тэатры і на якой сцэне ставіць спектакль?***

— Калі я толькі пачынала свой творчы шлях як рэжысёр, то мне было складана. Трэба было паламаць стэрэатып успрымання мяне як актрысы, зрабіць усё, каб мне паверылі ў новай якасці і пайшлі за мной. А вось ужо з гадамі ў рэжысуры, калі я прыходжу на новую пляцоўку, найперш гляджу, якія там ёсць вытворчыя магчымасці. Ці ўсе свае задумкі я змагу рэалізаваць, улічваючы творчы патэнцыял калектыву, фінансавыя магчымасці тэатра. Але самае галоўнае — гэта рэжысёрская здольнасць захапіць ідэямі, бачаннем будучага спектакля ўсіх, хто мае да яго лёсу дачыненне. Найбольш люблю працэс рэпетыцый, калі маю магчымасць назіраць за тым, як артысты захапляюцца матэрыялам. Гэта самае каштоўнае для мяне. А потым спектакль ужо набывае ўласнае жыццё.

***— Ведаю, што ваша жаданне пайсці ў рэжысуру было абумоўлена імкненнем гаварыць на тэмы, якія вас цікавяць і непакояць. У якой ступені гэта характарызуе ваш падыход да творчага працэсу?***

— Так, жаданне заняцца рэжысурай было матываванае тым, што ў

# «КЕРАМІКА — ГЭТА КОСМАС»



**Восенню вядомы беларускі кераміст Валерый КАЛТЫГІН адзначыў свой 75-гадовы юбілей. Выклікае захапленне, колькі гэты майстар паспеў зрабіць і колькі працягвае. Каля 30 гадоў ён узначальвае Бабруйскае гарадское аб'яднанне Беларускага саюза мастакоў, ладзіць унікальны міжнародны пленэр «Арт-Жыжаль», удзел у якім прымаюць майстры з розных краін свету. Але галоўнае — стварае непаўторныя гліняныя вырабы. Дастаткова аднаго погляду на работу, каб зразумець, што яна зроблена рукамі Калтыгіна.**

У творчасці майстра адлюстравана глыбіня і непаўторнасць чалавечага лёсу. У цыкле «У кожнага свой крыж» раскрываецца тэма развіцця асобы, яе зямных і духоўных дасягненняў. Адгукаецца мастак і на тэмы сучаснасці. Так, у серыі работ «Прыгажосць не схаваеш» дзеючыя асобы ўпрыгожаны медыцынскімі маскамі. У работах серыі пад назвай «І раптам прыляцела птушка» Валерый Калтыгін спалучыў супрацьлегласці, цяжар супраць бязважкасці: на баксёрскую пальчатку спартсмена апусцілася маленькая жвавая птушка...

Каб паглыбіцца ў гэты непаўторны творчы свет, мы адпраўляемся на радзіму мастака. Бабруйск — старажытны беларускі горад з непаўторным каларытам... Тут шмат можна знайсці для натхнення. Мастак адчыняе дзверы сваёй майстэрні, і мы адразу трапляем у іншае вымярэнне: тут вам і калекцыя газавых лямп, лічыльнікаў, савецкіх значкоў, бутэлек дзіўных форм — іх у майстра каля паўтысячы. З усіх бакоў на нас глядзяць героі яго вырабаў, ёсць і ўражанні з нялёгкага пасляваеннага дзяцінства.

— Я вырас у настаўніцкай сям'і, — расказвае мастак. — Памятаю, як бацька набыў мне першую кнігу. Мы паехалі з ім у горад, і на прылаўку я ўбачыў кнігу з чалавечкам на жоўтай вокладцы. «Тата, купі мне», — стаў прасіць. Па тых часах кнігі каштавалі танна, і ён яе ўзяў. Гэта аказаліся «Прыгоды бравага салдата Швейка» з ілюстрацыямі Ёзэфа Лады. Я ўвогуле шмат чытаў: калі вучыўся ў школе, хадзіў адразу ў тры бібліятэкі, а таксама была яшчэ і хатняя бібліятэка.



***— А чаму вас прывабіла кераміка?***

— Я не збіраўся быць керамістам. У 1960-я гады пасля арміі я хацеў ісці толькі на скульптуру. І калі хлопцы прапаноўвалі паспрабаваць кераміку, я адказваў, што гэта ж проста посуд! Я паступіў у мастацкі каледж імя Ларына, тады гэта было вучылішча № 15. А паступіў таму, што там адкрывалася спецыяльнасць «Скульптар-мадэльшчык». І гэта мяне падкупіла. На той момант мне было 24 гады, браць не хацелі. Але ў вучылішчы і потым у інстытуце я быў адным з найлепшых, вучыўся выдатна. У якасці студэнта я правёў восем плённых гадоў: экспедыцыі, семінары, старшынстваваў у студэнцкім навуковым таварыстве. Яшчэ ў вучылішчы перайшоў на «ганчарку» — трапіў на І Рэспубліканскі семінар народных ганчароў у Івянцы. Загарэўся гэтай справай па-сапраўднаму. Ужо ў інстытуце сур'ёзна заняўся ганчарствам пад кіраўніцтвам Уладзіміра Вікенцьевіча Угрыновіча. А разам з Міхасём Фёдаравічам Раманюком ездзіў у навуковую экспедыцыю.

рэжысёра ёсць права і магчымасць выбіраць для пастановак тых аўтараў, якія тэматыкай, філасофіяй і ідэямі цікавыя перш за ўсё яму самому. Прафесія ж акцёра абмяжоўвае рамкі свабоднага выбару. І такое размежаванне вельмі дакладнае. У працы над стварэннем спектакля рэжысёр галоўны, ідзе на некалькі крокаў наперад. Не заўсёды і не кожны акцёр адразу адкрыты для таго, каб зразумець, чаго я ад яго патрабую і чакаю. А мне хочацца дасягнуць паразумення з ім, бо праз акцёра я транслірую важныя для сябе і пастаноўкі тэмы. Калі ж мы будзем гучаць дысанансным хорам, то нічога не складзецца. Пры падборы каманды для працы над спектаклем для мяне важны кожны чалавек. І з часам, калі мы пачынаем чуць і адчуваць адно аднаго, я гатовая выслухаць і прапановы акцёра.

## «ТРАМВАЙ «ЖАДАННЕ»

***— Гледзячы на маладых калег-рэжысёраў, вы адчуваеце канкурэнцыю?***

— Мне падабаюцца маладыя творчыя людзі, іх цікавыя ідэі, таму што гэта дае магчымасць быць у іх часе. І я ніколі не адчуваю зайздрасці ці рэўнасці. Наадварот, яны выклікаюць у мяне пачуццё азарту, асабліва калі бачу цікавую працу, багатую праяўленнем інтэлектуальных і творчых магчымасцяў. Сёння моладзь мае да ўсяго доступ. Мы, у адрозненне ад іх, многага былі пазбаўлены, асабліва ў жаночай рэжысуры, якая лічылася недарэчнай. І даводзілася шмат працаваць, каб самой сабе найперш даказаць, што маеш права быць у прафесіі. Безумоўна, маладое пакаленне зараз больш падрыхтаванае прафесійна, але разам з тым важны жыццёвы вопыт і чалавечае сталенне да калег.

***— Аляксей Ераньков, аўтар музыкі да спектакляў, таксама таленавітая асоба і на многіх праектах вы працуеце ў тандэме. Ці заўсёды сугучныя ў ідэях і пошуках і ці не складана сям'і, калі двое — у творчасці?***

— Галоўнае ў любым саюзе, як творчым, так і сямейным, каб людзі разумелі, што яны дзве палавінкі аднаго цэлага. Я, напрыклад, ніколі не разумела творчай рэўнасці. І шчыра такому здзіўляюся. Так, мы з Аляксеем увесь час разам, у нас агульныя прафесійныя інтарэсы, і гэта тое паветра, якім мы дыхаем. У нас не бывае канфліктаў, хоць і здараецца, што кожны адстойвае сваё бачанне. У такіх выпадках ты павінна пераканаць, але і чуць таго, хто насупраць цябе. Акрамя таго, у нас розныя прафесіі: Аляксей — кампазітар, а я — рэжысёр.

***— Адносна нядаўна спіс пастаўленых вамі спектакляў папоўніўся яшчэ і «Трамваем «Жаданне». А калі б вы мелі магчымасць трапіць у яго, то чаго пажадалі б для сябе і для ўсіх нас?***

— Зараз я вельмі ўважліва сачу за тым, што адбываецца ў свеце. Таму вельмі б хацелася, каб людзі нарэшце пачулі адно аднаго і заўсёды памяталі, што яны — Людзі. І каб у згодзе ўсе разам мы загадалі адно жаданне: каб планета наша не ператварылася ў пыл і попел. Няхай спыняцца смерці і наступіць гармонія ў чалавечых адносінах. Я ўвесь час чамусьці згадваю эпізод з фільма «Уцёкі містара Мак-Кінлі», калі чалавек аказваецца на зямлі адзін, і толькі навокал вецер гуляе. І тады хочацца спытаць: калі ўсё знікне, пра што вы будзеце гаварыць, на што траціць свае грошы і што і каго любіць? Таму вельмі жадала б, каб побач былі заўсёды людзі з жывой душой. Тады і мне ў маёй прафесіі і жыцці будзе пра што марыць.



**Алена ДРАПКО.**
**Фота прадастаўлена Валянцінай ЕРАНЬКОВАЙ.**

З нагоды

# Горкаўскі. Традыцыя

**На гэтым тыдні свой 90-гадовы юбілей адзначыў Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага. Але знаўцы здаўна яго называюць проста рускі — і ўсе разумеюць, пра што гаворка, маючы пры гэтым на ўвазе ўсе заслугі тэатра і тых асоб, якія складалі яго калектыў у розныя гады. А гэта знакавыя асобы. Вядомыя, пазнавальныя, любімыя рэжысёры і артысты, пра якіх нават праз шмат гадоў ад пачатку працы складана гаварыць у мінулым, — іх дасягненні сталі гонарам для беларускага тэатральнага мастацтва. І гэта тая трупа, што зараз захоўвае традыцыі папярэднікаў і піша сваю частку гісторыі тэатра імя Горкага.**



Усё зафіксавана, адзначана і ўшанавана. Павіншаваў калектыў тэатра імя Горкага з юбілеем міністр культуры Беларусі Анатоль Маркевіч, які ўручыў ганаровыя адзнакі за ўнёсак у развіццё нацыянальнага тэатральнага мастацтва асобам, якія вызначаюць яго ўзровень сёння, сярод якіх шматгадовы дырэктар Эдуард Герасімовіч, мастацкі кіраўнік тэатра рэжысёр Сяргей Кавальчык, а таксама вядомыя артысты Сяргей Чэкерэс, Таццяна Гаркуша, Андрэй Дударэнка і іншыя супрацоўнікі тэатра, якія прысвяцілі яму жыццё.

У віншаванні Прэзідэнта Беларусі, якое зачытаў Анатоль Маркевіч, адзначана асаблівая роля тэатра імя Горкага, які «стаў папулярным цэнтрам прыцягнення знаўцаў драматычнага мастацтва... Дзякуючы натхнёнай працы некалькіх пакаленняў творчых работнікаў калектыў тэатра робіць значны ўнёсак у развіццё айчыннай выканальніцкай школы».

Адданая публіка сустрэла з асаблівымі эмоцыямі пачатак 90-га юбілейнага сезона, адзначыўшы ў афішы спектаклі, якія варта паглядзець. Гэты тэатр заўсёды шанаваў публіку і стараўся яе парадаваць глядацкімі пастаноўкамі. Нездарма ў «горкаўцаў» ёсць такія актыўныя прыхільнікі, якіх тут добра ведаюць і ў сваю чаргу адзначаюць на ўрачыстасцях адмысловымі падзякамі. Нездарма на святкаванне, якое адбылося 30 лістапада, абралі для паказу менавіта глядацкі спектакль у пастаноўцы мастацкага кіраўніка тэатра рэжысёра Сяргея Кавальчыка — яскравую і відовішчную рок-оперу «Граф Монтэ-Крыста».

Адпаведны настрой і добрыя пажаданні злучаліся з думкамі пра наступныя прэм'еры, у якіх можна рэалізаваць складаныя задумы. Сёння ў тэатра ёсць умовы для іх увасаблення — пасля рэканструкцыі і тэхнічнага пераабсталявання будынка, у якім Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага месціцца з 1949 года. Колішняя сінагога, пабудаваная на пачатку XX стагоддзя, стала прытулкам для трупы, якая даказала прафесіяналізм і жыццяздольнасць у папярэднія гады. І як змагалася за выжыванне. Трупа беларускага тэатра нават у найскладанейшых умовах ваеннага часу здолела захавацца. Цяпер гэта мінуўшчына, але гераічная, таму вартая таго, каб пра яе памяталі. І шмат у чым паказальная гісторыя людзей, якія клапаціліся пра тое, каб захаваць мастацтва Беларусі і вярнуць яго людзям у мірны час.

— Пасля смерці Уладзіміра Кумельскага, які лічыцца заснавальнікам Першага рускага тэатра БССР (які пасля атрымаў статус дзяржаўнага), яго ўзначаліў Дзмітрый Арлоў. Ён паглядзеў спектаклі, пазнаёміўся з трупай і зразумеў, што яе трэба ўмацаваць. Паехаў у Ленінград глядзець выпускныя курсы акцёраў, запрасіў на працу 20 чалавек. Сярод якіх, дарэчы, быў Фёдар Шмакаў, які пасля стаў народным артыстам СССР. Да вайны тэатр працаваў у Магілёве, — згадвае тэатральны крытык прафесар Таццяна Дзмітрыеўна Арлова. — Перад самай вайной яны паехалі на гастролі — павінны былі іграць прэм'еру 22 чэрвеня 1941 года. Яна не адбылася... І каб вярнуцца дадому, яны ішлі пешкі праз лясы, пад бамбёжкамі. Дзякуючы таму, што ў бацькі на пінжаку быў ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, ён здолеў спыняць кіроўцаў грузавікоў, тыя крыху падвозілі людзей. Рашэнне пра эвакуацыю тэатра прымалася ў Маскве. Як і Купалаўскі тэатр, рускі драматычны накіравалі ў Сібір. А там бацька ўвесь час чакаў добрых навін. Каб можна было вярнуцца ў Беларусь. І як толькі вызвалілі Мінск, у 1944 годзе яны прыехалі — фактычна на руіны. Тэатр накіравалі ў Гродна, дзе ён працаваў, пакуль не скончылася вайна і не з'явілася магчымасць пераехаць у сталіцу. У Мінску ігралі на сцэне Дома афіцэраў да таго часу, пакуль не атрымалі свой цяперашні будынак.

Імя Максіма Горкага тэатр атрымаў у 1955 годзе, у 1994-м стаў акадэмічным, а ўжо ў час незалежнай Беларусі яму надалі званне «Нацыянальны» — як найвышэйшую адзнаку працы. Сучасныя гледачы памятаюць вядомых асоб, якія яшчэ нядаўна вызначалі яго ўзровень — рэжысёра Барыса Луцэнку, народных артыстаў СССР Аляксандру Клімаву, Расціслава Янкоўскага, народных артыстаў Беларусі Юрыя Сідарава, Бэлу Масумян і іншых выдатных асоб. А сёння тут працягваюць служыць народныя артысты Беларусі Вольга Клебановіч і Аляксандр Ткачонак, а таксама залужаныя і проста любімыя акцёры, якія задзейнічаны ў рэпертуары, — 28 спектакляў у афішы тэатра на сённяшні дзень. І гісторыя працягваецца.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

---



***— Значыць, акадэмічнай адукацыі для мастака недастаткова?***

— Акадэмічная адукацыя — неабходная база. А вучуся я ўсё жыццё — стаўлю новыя задачы, эксперыментую. Шкадую, што ў школе абыякава ставіўся да хіміі і замежнай мовы. І калі пачаў займацца керамікай, прыйшлося ўспамінаць усе гэтыя аксіды, спірты, солі. Таму што абсалютна ўся кераміка пабудавана на тэхналогіі. Я ўжо не кажу пра ўласцівасці гліны як матэрыялу. Гэта ўсё трэба адчуваць, разумець і ведаць.

***— І ўсё ж такі ў чым розніца паміж скульптурай і керамікай?***

— Кераміка — гэта космас. Даследчыкі недаацэньваюць яе мастацкую каштоўнасць. Я магу стварыць скульптуру, але вось скульптар керамічны выраб — не. Скульптары зазвычай не разумеюць спецыфіку пустацеласці. Для іх гліна — звычайны пярвічны матэрыял для стварэння мадэлі, якую яны потым выкідваюць. Нездарма ж кажуць, што кераміка — гэта сінтэз трох класічных відаў мастацтва: скульптуры, графікі і жывапісу. Я сюды б дадаў яшчэ дызайн і архітэктуру. Таму што мысленне кераміста, які афармляе інтэр'еры, экстэр'еры, садова-паркавыя кампазіцыі, павінна быць адпаведным.

***— Вы — захоплены сваёй справай чалавек... І пры гэтым займаецеся грамадскай дзейнасцю. Як удаецца сумяшчаць?***

— З 1989 года я актыўна займаюся грамадскім жыццём. Бабруйскае аддзяленне Саюза мастакоў — адзінае гарадское ў Беларусі. Бабруйск — дастаткова вялікі горад, сёмы па памеры ў краіне. Некалі яго ўключылі ў склад Магілёўскай вобласці, і калі ў нас з'явілася больш за 13 мастакоў, мы паставілі пытанне аб тым, што хочам аддзяліцца ў асобны гарадскі саюз. І стварылі. Мы першыя ў Беларусі сярод абласных аб'яднанняў мастакоў адкрылі салон-краму. На жаль, яна праіснавала нядоўга, каля васьмі гадоў — пачалася перабудова, эканамічныя складанасці. Залу аддалі гораду, сёння там створана выставачная зала Бабруйскага мастацкага музея.

***— А як наконт маладой змены?***

— Саюз мастакоў, асабліва ў абласцях, нястрымна старэе. Шкада, што моладзь з'язджае для працягу адукацыі, асядаючы ў цэнтры. Калісьці разам з самадзейнымі творцамі ў Бабруйску было каля 70 мастакоў. Цяпер нават гарадскую выставу зрабіць цяжка — вядучыя мастакі ўжо нябожчыкі, на жаль. Засталося толькі некалькі чалавек, якія здольны працаваць на вартым творчым узроўні. Таму вяртаемся да таго, што станем філіялам Магілёўскай абласной арганізацыі.

***— Якія творчыя планы?***

— 2023 год будзе юбілейным для «Арт-Жыжаля» — спадзяюся, што пленэр пройдзе на ўзроўні. У гэтым годзе ладжу семінары ў сваёй майстэрні, пры падтрымцы Беларускага саюза мастакоў. Канцэпцыя такая: наколькі некераміст можа выявіць свой творчы патэнцыял у іншым матэрыяле, — тэкстыльшчыкі, графікі і скульптары працуюць з керамікай. На некалькі дзён да мяне прыязджаюць невялікія групы мастакоў, лепяць, а я ўсё гэта абпальваю, а потым глазурую. Курырую, тлумачу, раю. Даволі цікавы працэс — семінар доўжыцца да гэтага часу. Каардынуе яго мастацтвазнаўца, першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля Шаранговіч. Мне падабаецца працаваць з маладзейшымі мастакамі. У іх яшчэ ёсць азарт, творчы імпэт.

Па выніках пленэраў у горада сабралася калекцыя вельмі вартых работ мастакоў з 25 краін. Але яны ўсе запакаваныя ў скрыні. Спачатку я хацеў стварыць музей керамікі, потым — галерэю, затым — цэнтр сучаснай керамікі. Патрэбна памяшканне. Але пакуль пытанне не вырашанае. Хачу, каб вырабы працавалі, — давайце хаця б зробім філіял пры мастацкай школе! Будзем там ладзіць заняткі для дарослых і дзяцей, чытаць лекцыі, у нас будзе галерэя. Уяўляеце, як бы гэта прагучала для ўсёй краіны?

***— Ці можаце сфармуляваць сваё творчае крэда?***

— Для мяне як для мастака самае галоўнае — выяўленне сябе, уласнага погляду на жыццё, на матэрыял, з якім працую. Калі адчуваю, што ў прыдуманай мною ідэі пачынаюцца паўторы, адразу ж спыняюся, пераключаюся на новае. Я вельмі шмат займаўся самаадукацыяй: на стале заўсёды ляжалі паэтычныя зборнікі, філасофскія кнігі, проза. Кожны робіць сам сябе. Я заўсёды казаў: чым больш у цябе абавязкаў, тым больш апраўданае жыццё.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 16 декабря 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–5; 7; 22; 28; 29; 35; 46; 48; 49; 50) со снижением на 70 %** **размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».** Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.09.2021г. №184 (29553). **ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–5; 8–16; 19, 21, 24, 25; 27, 30; 32–35; 42–50, 53) со снижением на 70 % размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».** Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 25.01.2022 г. № 15 (29637). **ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА в количестве 77 единиц оборудования (№№ лотов 8–84) со снижением на 50 % размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».** Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.09.2022 г. № 188 (29810) | | | |

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 16 декабря 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 50 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

**Условие продажи:** **1.** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Земельный участок под объекты продажи **(лоты №№ 1–6)** будет выделен по заявке нового собственника согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продажи прилагается). **Информация о земельном участке: лоты №№ 1–6** расположены на земельном участке с кадастровым номером **340800000004000100** общей площадью **8,5646 га (право постоянного пользования). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Целевое назначение земельного участка:** для строительства и обслуживания производственных зданий завода (для размещения объектов промышленности)

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14071**, площадью **139,2 кв. м**, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное здание для хранения легковоспламеняющейся жидкости.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8 | 7 400,00 | **740,00** |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14065**, площадью **1 159,5 кв. м**, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административно-бытовое здание.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8/10. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «Сбер Банк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 16.11.2015 № 320-00035/15-01 договор о залоге (ипотека) | 165 000,00 | **16 500,00** |
| 3 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14066**, площадью **1 553,2 кв. м**, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **двухэтажное кирпичное административно-бытовое здание с пристройкой.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «Белагропромбанк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 03.12.2012 № 275 договор о залоге (ипотека) | 183 500,00 | **18 350,00** |
| 4 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14068**, площадью **10 036,2 кв. м**, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание цеха новой техники с кирпичной отапливаемой пристройкой для ремонта шаровых кранов.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «Белагропромбанк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 03.12.2012 № 275 договор о залоге (ипотека) | 758 500,00 | **75 850,00** |
| 5 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14108**, площадью **12 563,1 кв. м**, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **цех металлоконструкций.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8/9. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «Сбер Банк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 24.02.2016 №320-00003/16-01 последующий договор об ипотеке, договор об ипотеке от 30.05.2016 № 320-00013/16-01 | 901 500,00 | **90 150,00** |
| 6 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-37925**, площадью **44,3 кв. м**, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **здание проходной.** В состав лота входят: ворота механические (инв. № 20351), крановая эстакада (инв. № 792). Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8/15 | 101 550,00 | **10 155,00** |
| 7 | Металлический склад для пропана (инв. № 60442). Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8 | 3 050,00 | **305,00** |

**Продавец:** открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», 247210, г. Жлобин, Гомельская область, ул. Школьная, 8.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029)303-53-09, Григорович Павел Карлович.**

**Шаг аукционных торгов** – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в российских рублях (RUB) – ПАО Сбербанк г. Москва, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, ИНН 7707083893, к/с 30111810800000000154, БИК BLBBBY2X, ОАО «Белинвестбанк», УНП 807000028, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 3 декабря 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 14 декабря 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.09.2022 г. № 188 (29810). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-53, 8 (029) 651-22-19, 8 (044) 599-18-16.**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Асилак» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества в составе:**

### ЛОТ № 1: ЖИЛОЙ ДОМ

*(составные части и принадлежности: сени, веранда, 2 (два) сарая, сарай-пристройка, навес, уборная, забор, калитка)*, **общей площадью 54,4 кв. м, инв. № 623/С-400, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625683208701000094 (право аренды до 30.03.2072) площадью 0,2417 га по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, д. Хоромицкие, ул. Центральная, 6.**

Начальная цена без НДС – **892,13** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **89,00** бел. руб.

### ЛОТ № 2: ОДНОКВАРТИРНЫЙ ЖИЛОЙ ДОМ

*(составные части и принадлежности: веранда, 2 (два) сарая, 4 (четыре) сарая-пристройки, уборная, забор)*, **общей площадью 47,9 кв. м, инв. № 623/С-3289, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625683208701000093 (право аренды до 30.03.2072) площадью 0,2500 га по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, д. Хоромицкие, ул. Центральная, 3.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0044 га.*

Начальная цена без НДС – **3 628,80** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **362,00** бел. руб.

### ЛОТ № 3: ОДНОКВАРТИРНЫЙ ЖИЛОЙ ДОМ

*(составные части и принадлежности: жилая пристройка, 2 (два) сарая, терраса, уборная, забор)*, **общей площадью 58,4 кв. м, инв. № 623/С-3287, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625683208701000095 (право аренды до 14.04.2072) площадью 0,1674 га по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, д. Хоромицкие, ул. Центральная, 13.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0031 га.*

Начальная цена без НДС – **2 894,94** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **289,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе затраты на публикацию извещения о проведении аукциона. Кроме того, победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает (продавцу) затраты на изготовление правоустанавливающих документов в следующем размере: по лоту № 1 – 937,00 бел. руб.; по лоту № 2 – 894,00 бел. руб.; по лоту № 3 – 967,00 бел. руб.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 20.09.2022, 11.11.2022.

Аукцион состоится **05.01.2023** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.01.2023** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11, тел. для осмотра 029-184-14-26.**

УНН 600002374

---

**Антикризисный управляющий – ООО «СтанИБор»** (УНП 491343813) – **проводит третьи повторные торги со снижением на 30 % в форме открытого аукциона**

### ПО ПРОДАЖЕ ИНДИВИДУАЛЬНЫХ КАПИТАЛЬНЫХ ГАРАЖЕЙ (6 лотов) ОАО «Мозырский спиртоводочный завод»

(производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 118-10Б/2016).

**Торги состоятся 20.12.2022 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.

Заявки принимаются с 9.00 05.12.2022 по 19.12.2022 до 17.00 по указанному адресу.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены предмета торгов.

Сумма задатка – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Подробную информацию по торгам можно получить на **www.bankrot.gov.by,** на сайте организатора аукциона **www.cpo.by** и по тел.: **+375 29 805 93 30** (Светлана Павловна); **+375 29 871 70 25** (Константин Николаевич).

---

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении **22 декабря 2022 год**а аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества в рамках **346-го** открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество)

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 54 | УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичская дистанция гражданских сооружений, тел. +375 163 495601 | **г. Гродно, ул. Будённого, 37** | 33,60 | 3,0 | 141,96 | Помещения под размещение склада, офиса, оказание услуг (за исключением п.1.4.1 Приложения 2 к Положению, утв. Указом Президента РБ от 29.03.2012 № 150), розничная торговля. **Срок аренды – 3 года** |
| 55 | | **г. Гродно, ул. Будённого, 37** | 73,90 | 3,0 | 312,23 | Помещения под размещение склада, офиса, оказание услуг (за исключением п.1.4.1 Приложения 2 к Положению, утв. Указом Президента РБ от 29.03.2012 № 150), розничная торговля. **Срок аренды – 3 года** |
| 56 | УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичская дистанция гражданских сооружений, тел. +375 163 495304 | **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Вокзальная , д. 11** | 217,40 | 36,78 БАВ | 651,41 | 1-этажное здание пакгауза и рампа под размещение склада, организация розничной торговли, оказание услуг. **Срок аренды – 3 года** |
| 57 | | **Минская обл., Столбцовский р-н, г. Столбцы, ст. Столбцы, 1** | 20,70 | 3,0 | 87,46 | Помещения под организацию розничной торговли, оказание услуг, размещение родственников. **Срок аренды – 3 года** |
| 58 | Белорусский государственный университет, тел. 80172095522 | **г. Минск, ул. Революционная, 11** | 6,80 | 3,0 | 43,10 | Часть вестибюля первого этажа под размещение вендинговых аппаратов. **Срок аренды – 1 год** |
| 59 | | **г. Минск, ул. Советская, 14** | 6,75 | 3,0 | 42,78 | Часть коридора первого этажа под размещение вендинговых аппаратов. **Срок аренды – 1 год** |
| 60 | УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Минская дистанция гражданских сооружений, тел. 8017 2256622 | **г. Минск, ул. Бобруйская, 19-1Н** | 53,60 | 3,0 или 80,4 БАВ | 226,46 | Помещение под административные цели (офис), оказание страховых услуг, услуг здравоохранения, в том числе медицинских и косметологических услуг, услуг образования, кроме ритуальных услуг и хосписа. **Срок аренды – 5 лет** |
| 61 | | **г. Минск, ул. Чкалова, 11-81** | 64,00 | 3,0 или 86,4 БАВ | 270,40 | Помещение для размещения офиса; для организации розничной торговли товарами медицинского назначения (оптика, контактные линзы и др.); для размещения аптеки, банка; для оказания страховых услуг; для оказания услуг здравоохранения; для оказания услуг образования; для размещения объекта общественного питания; для организации розничной торговли продовольственной и непродовольственной групп товаров, кроме товаров, бывших в употреблении и товаров ритуального назначения. **Срок аренды – 5 лет** |

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10. Аукцион состоится **22 декабря 2022 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 29 ноября 2022 г. по 16 декабря 2022 г.** включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Расчетный счет для перечисления задатка: BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – задаток для участия в аукционе **№ 346 от 22.12.2022** по предмету аукциона № ___.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»). Телефон для справок **+375 (17) 360 42 22.**

Слова пісьменніка

**Аляксандр РАДЗЬКОЎ**

# РЭКТАРЫ: урыўкі з кнігі




Пасля прафесара Бадакова з 1994 да 1997 года Гродзенскім універсітэтам кіраваў вучоны-фізік, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Леанід МікалаевічКівач.

У 1996 годзе я выходзіў на абарону доктарскай дысертацыі, і спецыялізаваны савет вызначыў мне апаніруючай арганізацыяй Гродзенскі ўніверсітэт. Калегі запрасілі мяне выступіць у іх па тэме даследавання. Прыехаўшы ва ўніверсітэт, я прадставіўся рэктару і запрасіў яго на сваё выступленне. Ён прыняў мяне ў кабінеце. Раней мы не былі знаёмыя, таму гаварылі нядоўга і вельмі стрымана. Спаслаўшыся на занятасць, паслухаць маё выступленне Леанід Мікалаевіч адмовіўся. Я яшчэ падумаў, што прытрымліваецца службовай дыстанцыі: я першы прарэктар, а ён рэктар.

Паслухаць маё выступленне прыйшлі ўсе мае сябры, калегі, выкладчыкі, якім была блізкая ці проста цікавая тэма дысертацыі. Да гэтага часу я ўжо быў блізка знаёмы з прарэктарамі ўніверсітэта доктарам фізіка-матэматычных навук, прафесарам Іванам Платонавічам Мартынавым, доктарам фізіка-матэматычных навук, прафесарам Яўгенам Аляксеевічам Роўбам, з загадчыкам кафедры матэматычнага аналізу, доктарам фізіка-матэматычных навук, прафесарам Юрыем Мікіртывічам Вувунікянам, з загадчыкам кафедры алгебры, геаметрыі і методыкі выкладання матэматыкі, кандыдатам фізіка-матэматычных навук, дацэнтам Юрыем Пракопавічам Залатухіным, з загадчыкам кафедры педагогікі доктарам педагагічных навук, прафесарам Віктарам Пятровічам Тарантэем, таму разам з імі прыйшлі і іх вучні. Выступаў я і адказваў на пытанні каля дзвюх гадзін, пасля былі выступленні з ацэнкамі маіх рэзультататаў. Абстаноўка на семінары была добразычлівая, але строгая, дзелавая. Скончылася ўсё да сямі гадзін вечара.

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая; 11 чэрвеня; 9, 16, 23, 30 ліпеня; 13, 20, 27 жніўня; 3, 17, 24 верасня; 1, 8, 15, 29 кастрычніка, 5, 12, 26 лістапада.)*

Але Іван Платонавіч сказаў, што рэктар чакае мяне для размовы. Я адзначыў, што Леанід Мікалаевіч перш за ўсё вучоны. Яму, безумоўна, далажылі, што я вывучаю прымяненне тэставых методык у навучанні матэматыцы, а ён інтуітыўна адчуваў перспектыву іх развіцця, шырокага прымянення ў адукацыйным працэсе. Вось гэтая размова ў нас ужо была змястоўнай. Рэктара сапраўды хвалявалі гэтыя тэмы, і ён не хаваў сваёй зацікаўленасці. Гутарылі мы даверліва і ўжо не толькі пра маю дысертацыю. Шчырасці спрыяла і кава, якой мяне частаваў Леанід Мікалаевіч.

З таго часу пры сустрэчах у міністэрстве мы віталіся, коратка, але ўсё ж абменьваліся навінамі і ўражаннямі пра атрыманыя ў міністэрстве ўстаноўкі і ўвогуле пра жыццё. Пасля нечакана для сябе я даведаўся, што ў адносінах рэктараКівача заведзена крымінальная справа, звязаная ці то з парушэннямі фінансавай дысцыпліны, ці то ізноў жа з карупцыяй. Ён быў асуджаны, адбываў тэрмін. Пасля, убачыўшы яго ва ўніверсітэце, я да яго падышоў, мы крыху пагаварылі — ветліва, але стрымана: шчырасці ўжо не было.

Рэктару, як і любому кіраўніку, у сваіх дзеяннях даводзіцца зачастую і рызыкаваць, прымаць рашэнні па сітуацыях, якія не прапісаны ні ў адным законе і ні ў адной інструкцыі. У такіх выпадках надзвычай небяспечна браць рашэнне толькі на сябе. Асабліва, калі гэта датычыцца фінансавых пытанняў. Для такіх тэм прадугледжаны фарматы калегіяльнага рашэння, кансультацый з вышэйшымі кіраўнікамі. У супрацьлеглым выпадку зыход можа быць журботны. Такі, як бачым, здараўся і ў практыцы рэктарскай працы.

Пасля прафесараКівача Гродзенскі ўніверсітэт узначаліў доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Сяргей Аляксандравіч Маскевіч. Вось ужо з гэтым гродзенскім рэктарам лёс мяне паяднаў грунтоўна! Сяргей Аляксандравіч — выпускнік Гродзенскага педінстытута і там прайшоў усе прыступкі станаўлення ў ВНУ ад выкладчыка да рэктара. Пазнаёміўся я з ім, яшчэ калі быў першым прарэктарам Магілёўскага ўніверсітэта, але з таго часу мы ўжо не разыходзіліся. З Магілёва я мог яму пазваніць, параіцца па ўніверсітэцкіх справах, абмеркаваць перыпетыі бягучага жыцця, распытаць пра сваіх гродзенскіх сяброў. Пасля майго прызначэння міністрам адукацыі мы пачалі бачыцца і гаварыць ужо шмат часцей. Але яшчэ да яго абрання дэпутатам Нацыянальнага сходу мы паспелі дамовіцца з губернатарам Гродзенскай вобласці Уладзімірам Ягоравічам Саўчанкам пра пачатак будаўніцтва так патрэбнага ўніверсітэту інтэрната для студэнтаў. У Палаце прадстаўнікоў Сяргей Аляксандравіч узначаліў пастаянную камісію па міжнародных сувязях і нацыянальнай бяспецы. У міністэрстве бываў часта: прысутнічаў на пасяджэннях калегіі, удзельнічаў у рабоце камісій, проста заходзіў да мяне ў кабінет паразмаўляць. Мы з ім адразу зрабіліся аднадумцамі, але адзін аднаго дапаўнялі — я ж быў рэктарам усходняга ўніверсітэта, а ён — заходняга. Здавалася б, і адлегласць паміж імі меней чым тысячу кіламетраў, а спецыфіка ўніверсітэцкага жыцця нязначна, але адрознівалася. Напрыклад, многія яго прафесары і дацэнты ездзілі выкладаць у асноўным у польскія ВНУ, а мае — у расійскія. Але мая праца ў міністэрстве, а яго ў парламенце нас ураўнавала, дадала палітычны маштаб, глыбіню разумення адукацыйных працэсаў, у тым ліку і ў вышэйшай школе. Таму пасля майго прызначэння першым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта я прапанаваў на пасаду міністра адукацыі прафесара Маскевіча. Прэзідэнт з гэтай прапановай пагадзіўся. Сяргей Аляксандравіч працаваў міністрам са снежня 2010 года да снежня 2014 года. У Адміністрацыі Прэзідэнта я курыраваў сацыяльную сферу, таму з міністрам Маскевічам мы ізноў працавалі плячо ў плячо.

Мне бачыцца, што прызначэнне міністрам адукацыі рэктара ўніверсітэта, дакладней рэктара ці прарэктара педагагічнай ВНУ, — прафесійна абгрунтаванае кадравае рашэнне. Яго ўся сістэма ўспрымае як выхадца са свайго асяроддзя. Рэктар кіраваў падрыхтоўкай выхавальнікаў дзіцячых садкоў, настаўнікаў, выкладчыкаў ПТВ і каледжаў, удзельнічаў у падрыхтоўцы праграмных дакументаў развіцця адукацыі, вучэбных стандартаў, планаў, праграм і дапаможнікаў да іх. Як вучоны ён ведае навуковы свет: у адукацыйным асяроддзі гаворыць з кожным на даходлівай і зразумелай мове. Таму і міністра Маскевіча сістэма прыняла. Усе свае рашэнні ён грунтоўна абдумваў, максімальна пралічваў іх пазітыўныя і негатыўныя наступствы. Можа быць, часам доўга думаў, але ж пры маштабе міністэрства ўжо дакладна гарачыцца нельга (як былы рэктар ён гэта ведаў).

Пасля працы ў міністэрстве Сяргей Аляксандравіч узначаліў Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава, які пасля ўвайшоў у склад БДУ. Мы і цяпер з рэктарам Маскевічам абмяркоўваем многія пытанні.

Першаму прарэктару Сяргея Аляксандравіча Маскевіча Яўгену Аляксеевічу Роўбу ў 2004 годзе я прапанаваў узначаліць Гомельскі ўніверсітэт, ён там шэсць гадоў загадваў кафедрай:

— Пасаду першага прарэктара ты ўжо перарос. Рэктар Маскевіч — фігура маштабная і аўтарытэтная, ты яе не зваліш і не пераступіш. Прапаноўваю табе ўзначаліць універсітэт у Гомелі.

Пасля гэтага я назіраў, як прафесар Роўба пакутліва абдумваў маю прапанову. А я настойваў. Напрыклад, пасля пасяджэння калегіі міністэрства, куды ён часам прыязджаў замест Маскевіча, даганяў яго і ціха ў спіну казаў:

— Маскевіча не пераступіш! А ў першых прарэктарах ужо засядзеўся!

Роўба напружваўся, цяжка ўздыхаў, але ў выніку выязджаць з Гродна адмовіўся. Пры гэтым ні я, ні ён, ні сам Маскевіч тады нават не ўяўлялі, што рэктара Гродзенскага ўніверсітэта людзі выберуць у Палату прадстаўнікоў і прафесар Роўба стане рэктарам у сваім універсітэце. Ён быў напоўнены ідэямі развіцця ўніверсітэта: будаўніцтвам новага галоўнага вучэбнага корпуса, адкрыццём факультэта турызму, інжынерна-будаўнічых спецыяльнасцяў і філіяла ў Лідзе. Здаралася, памыляўся падчас прыняцця кадравых рашэнняў ці дужа давяраў сваім падначаленым, але быў аўтарытэтны як кіраўнік і ў сваім калектыве, і сярод калег-рэктараў. Сышоў з пасады рэктара ў 2013 годзе. На яго месца міністр адукацыі С. А. Маскевіч прапанаваў загадчыка кафедры педагогікі ўніверсітэта, доктара педагагічных навук Андрэя Дзмітрыевіча Караля. Ён выпускнік інжынернага факультэта Гродзенскага ўніверсітэта, працаваў настаўнікам у сярэдняй школе, выкладаў на кафедры матэматычных дысцыплін у гродзенскім філіяле Інстытута сучасных ведаў, пасля ў Гродзенскім медыцынскім універсітэце і, нарэшце, вярнуўся ў сваю родную ВНУ. Як высветлілася, ненадоўга — у 2017 годзе быў прызначаны рэктарам БДУ. Рэктары Гродзенскага ўніверсітэта заўжды былі прыкметнымі і перспектыўнымі.

Цяпер універсітэт узначальвае кандыдат гістарычных навук, дацэнт Ірына Фёдараўна Кітурка. Яна таксама выпускніца Гродзенскага ўніверсітэта і ў сваёй роднай ВНУ паслядоўна асвойвала ўсе прыступкі кіравання вучэбным працэсам, перад прызначэннем кіраўніком працавала першым прарэктарам. Наш першы ў Заходняй Беларусі ўніверсітэт прадаўжае сваё развіццё.

**Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*(Працяг будзе 10 снежня).*

Прыклад для пераймання

# НІТКІ ДАБРЫНІ І СПАГАДЫ



**Дзясяткі неабыякавых энтузіястаў з розных куткоў Беларусі падтрымалі кранальную ініцыятыву педагогаў і навучэнцаў Гомельскага медыцынскага каледжа. Разам яны вяжуць малюсенькае адзенне і першыя цацкі для немаўлят, якія нарадзіліся раней належнага тэрміну.**

Год таму ў Гомельскім медыцынскім каледжы была аб'яўлена дабрачынная акцыя «Штонікі для спяшонікаў» («Штанишки для торопыжек»). Яе ініцыятарам стала намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа Ларыса Кавалеўская. Ларыса Вітальеўна пачала сама і паказала прыклад усім ахвотным — педагогам і навучэнцам, як вязаць камплекты для лялечных пупсаў, такія неабходныя для немаўлят з крытычна малой масай цела.

Дзеці, якія нарадзіліся раней тэрміну, схільны праводзіць амаль увесь час як бы ў забыцці, расказваюць аб важнасці вязаных рэчаў для дзетак гомельскія медыкі. Рэчы з натуральнай ваўнянай пражы ўздзейнічаюць на рэфлекторныя зоны цела немаўляці. Гэта нясе танізуючае, агульнаўмацавальнае ўздзеянне і спрыяе росту і развіццю дзіцяці. Для ўдзельнікаў дабрачыннай акцыі вязанне камплектаў — гэта яшчэ і магчымасць падтрымаць сем'і, якія сутыкнулася з нараджэннем дзіцяці раней тэрміну.

Летась педагогі і навучэнцы перадалі звязаныя камплекты для немаўлят у Гомельскую абласную дзіцячую клінічную бальніцу. Але акцыя не толькі не збавіла абароты, але і заахвоціла жыхароў розных гарадоў краіны.

— Наладзілі сувязь з вязальшчыкамі з Мінска, Мар'інай Горкі, іншых гарадоў. Хтосьці перадае пражу, а хтосьці — не толькі гатовыя камплекты адзення, але і звязаныя цацкі-васьміножкі, вядомыя як тактыльная замена пупавіны, што дапамагае супакойвацца немаўляці, — адзначае **педагог-псіхолаг Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа Марыя КАМАРОВА.** — У акцыі з вялікім задавальненнем працягваюць прымаць удзел нашы навучэнцы. Адна з іх, Ліза Носар, перадала некалькі пледаў, якія дзяўчына звязала разам са сваёй мамай, дарэчы, былой выпускніцай нашай навучальнай установы. Падтрымліваюць акцыю і людзі, якія не могуць вязаць, але вельмі жадаюць зрабіць штосьці добрае, паспачуваць.

Так, другі год вязальшчыцам Гомельскага медкаледжа пражу для маленькага адзення перадае невядомы спонсар акцыі — малады чалавек позна вечарам пакідае пакункі з ніткамі на вахце каледжа.

— Цяпер да нашай дабрачыннай ініцыятывы падключыліся і супрацоўнікі гомельскіх аптэк. Яны вырашылі падтрымаць мамачак немаўлят гігіенічнымі сродкамі, неабходнымі для самых маленькіх, — дадае Марыя Камарова.



Днямі выкладчыкі і навучэнцы Гомельскага медкаледжа перадалі амаль 150 звязаных рэчаў для маленькіх пацыентаў радзільнага аддзялення Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы № 3 і абласнога клінічнага радзільнага дома.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

**Фота Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа.**

# «ПУХНАЦІКІ» Ў ГОРАДЗЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Колькі людзей — столькі меркаванняў: нямала і тых, каму па душы, што ўпрыгожаным наваколлем набліжаюць усімі любімае свята. І ўсё ж першыя навагоднія сімвалы на гарадскіх вуліцах, калі да навагодняй ночы заставалася яшчэ больш за месяц, выклікаюць некаторае здзіўленне. Вядома, у многіх краінах калядны сезон пачынаецца якраз у лістападзе. Напрыклад, у Канадзе нават у дамах new year tree ставяць у канцы лістапада, а калядныя распродажы стартуюць яшчэ раней. Але ў Беларусі раней традыцыйна ўпрыгожваць вуліцы і ставіць ёлкі пачыналі дзесьці з 10 снежня, а ў дамах навагоднія ёлкі прыбіралі пасля 20 снежня. Сёлета да 15 снежня сталіцу вырашана цалкам упрыгожыць да Новага года, расказалі ў «Мінскрэкламе». А наогул канцэпцыю навагодняга ўпрыгожвання Мінска дызайнеры пачалі распрацоўваць яшчэ ў ліпені — жніўні. Бо перад імі стаяла задача прыдумаць убранне амаль трох дзясяткаў ёлак, а таксама канцэпцыю святочнай ілюмінацыі горада.

Уласна, аб тым, як будзе ўпрыгожана сталіца, калі ўсе мерапрыемствы па яе навагоднім афармленні завершацца, дызайнеры ўжо распавялі. Нам застаецца толькі скласці ўласнае ўражанне, калі ўсё будзе гатова. Святочную ілюмінацыю «Мінгарсвятло» плануе ўключыць таксама з 15 снежня (у гэтыя ж тэрміны светлавыя дэталі навагодняга афармлення ўключалі і ў два папярэднія гады, так што, магчыма, нам толькі здаецца, што вуліцы ўпрыгожваюць рана). Навінкай гэтага года стане афармленне мачтаў асвятлення каляднымі вянкамі. Што датычыцца ёлак са светлавымі гірляндамі, то ўсяго ў сталіцы іх усталююць 26: у парках, на плошчах, перад буйнымі гандлёвымі аб'ектамі. Як мінімум шэсць з іх былі цалкам прыбраны яшчэ да 1 снежня (у прыватнасці, каля Палаца дзяцей і моладзі і каля ўнівермага «Беларусь»). Многія навагоднія ёлкі па Мінску ў канцы лістапада былі ўсталяваны, але яшчэ не ўпрыгожаны. Навагоднія фотазоны ствараюцца на Кастрычніцкай плошчы, праспекце Незалежнасці, каля цырка. Зазззяе агнямі ў сярэдзіне снежня і галоўная ёлка краіны (на Кастрычніцкай плошчы). Навагодняе дрэва вышынёй 30 метраў упрыгожаць шэсць тысяч рознакаляровых цацак. А побач з галоўнай ёлкай размесціцца ажурныя аркі і казачны гарадок. «Рыцарскі горад» будзе пабудаваны каля Палаца спорту — ён стане сцэнай для навагодніх мерапрыемстваў. Дададзім, што ёлачныя кірмашы адкрыюць сезон з 22 снежня. Адрасы іх традыцыйныя — як правіла, месцічы ведаюць, куды кожны год у снежні ісці па ялінку. Аб цэнах на жывыя і штучныя ёлкі абавязкова раскажам пазней.

## СІМВАЛ ГОДА

Адным з цэнтральных элементаў навагодняга дызайну сталіцы сёлета стаў заступнік надыходзячага года па ўсходнім календары. Трус, які сімвалізуе 2023 год, — чорны, а стыхія надыходзячага года — вада. Дарэчы, год Труса лічыцца адным з самых спакойных і шчаслівых, небагатых на ўзрушэнні гадоў у 12-гадовым цыкле ўсходняга календара. Трус пазбягае сварак як у грамадстве, так і ў сям'і. Ён абяцае завяршэнне канфліктаў. Так што фігуркі на вуліцах і ў дамах, закліканыя «задобрыць» заступніка года, дарэчныя і з пункту гледжання добрай навагодняй магіі, і з пункту гледжання «цёплага» навагодняга настрою.



Нашэсце «даўгавухіх» на навагодніх кірмашах.

Убачыць «пухнацікаў» ужо можна каля ЦУМа — зайцы ў чалавечы рост вітаюць пакупнікоў на яго прыступках. Вітрыну ГУМа ўпрыгожылі персанажы навагодняй казкі «Шчаўкунок»: у прыватнасці, цудоўны мышыны кароль. Дзе яшчэ варта шукаць сімвал года на мінскіх вуліцах? У мінулым годзе ў парку Чалюскінцаў былі ўсталяваны светлавыя фігуры дванаццаці жывёл усходняга гараскопа. Сёлета такіх навагодніх экспазіцый дызайнеры абяцаюць дзве — у парках Чалюскінцаў і Горкага. Можна будзе сфатаграфавацца на памяць з «нябесным зверам», у год якога вы нарадзіліся, і, вядома, з заступнікам надыходзячага года — трусам. Ёлачныя цацкі-трусы ручной працы ўпрыгожаць ёлку на плошчы Незалежнасці. І, вядома, трусоў ужо дастаткова на паліцах навагодніх секцый у крамах і гандлёвых цэнтрах па ўсёй краіне.

Першымі — яшчэ ў апошняй дэкадзе лістапада — упрыгожваць свае вітрыны і памяшканні пачалі крамы і гандлёвыя цэнтры. Зараз навагодні асартымент ужо паўсюдна шырока прадстаўлены. У ЦУМе, ГУМе, гандлёвых цэнтрах працуюць «навагоднія кірмашы»: гірлянды, «дожджык», мішура, штучныя ёлкі і зайцы ў самым розным выкананні.

— Вядома, па ёлачныя цацкі і мішуру большасць пакупнікоў прыйдзе бліжэй да сярэдзіны снежня, — кажа прадавец секцыі цацак ГЦ «Свята», дзе ўжо таксама ёсць навагодні асартымент. — Але вось фігуркі трусоў ужо актыўна купляюць. Карпаратывы пачнуцца досыць хутка, недзе з 20 снежня, і сімвал года як навагодні сувенір ідэальны, каб павіншаваць кагосьці з калег. Або, напрыклад, суседзяў, сяброў, сваякоў. Так што многія вырашаюць мець у запасе сімвал года загадзя.

Каштуюць «вушасцікі» па-рознаму: ад 7 рублёў за мілых плюшавых зайцоў памерам у далонь (іх зручна прычапіць на ключы або заплечнік як тэматычнае навагодняе ўпрыгожванне або талісман) да 50 рублёў за важкага зайца-скарбонку.

Калі казаць пра трусоў, то на навагодніх кірмашах заўважаныя футравыя зайцы-бірулькі з вісячымі доўгімі вушамі, якія былі неверагодна папулярныя годзе гэтак у 2017-м (іх аўтарства належыць дызайнеру Эле Лью). Памятаеце, тады іх насілі не толькі дзеці і падлеткі на заплечніках, але і дарослыя жанчыны на дзелавых сумках. Зараз, паколькі ідзе год Труса, такія ўжо прызабытыя зайкі вярнуліся на прылаўкі (каштуюць каля 17 рублёў).



Ці не стане навагодняе аздабленне звыклым падчас доўгага чакання свята?

## СВЯТА ЯШЧЭ ДАЛЁКА?

У цэлым, прыкметна, што ў гэтым навагоднім сезоне захавалася мода на пухнатыя ёлачныя цацкі — з мехам, варсінкамі, пер'ем. І, улічваючы пухнаты сімвал года, гэта цалкам лагічна. Сёлета, калі казаць аб колерах ёлачных цацак, у асартыменце шмат далікатных пастэльных тонаў — крэмавага, белага, прыглушана-залатога, далікатна-ружовага. Яркай колеравай гамы — напрыклад, чырвонага і фіялетавага, папулярных навагодніх колераў у мінулыя святочныя сезоны, — на прылаўках няшмат. Што да цэн, то ў фікс-прайсах наборы навагодніх шарыкаў можна купіць ад 5 рублёў. Шарыкі прыгажэйшыя ў сярэднім каштуюць 5—7 рублёў за штуку, фігуркі — даражэй. Але ўважлівыя да навагодняга антуражу мы пакуль не прыцэньваліся, а спыталі ў пакупнікоў у навагодніх секцыях і проста мінчан, ці не рана, на іх думку, у гэтым годзе на вуліцах і ў гандлёвых цэнтрах ствараецца «навагодні настрой»?

***Святлана, 34 гады, настаўніца:***

— Бадай што ранавата. З аднаго боку, вядома, атрыбутыка любімага свята на вуліцах і ў крамах узнімае настрой, з іншага — да Новага года ўсё гэта стане звыклай карцінай, і сыдзе адчуванне цуду. Занадта доўгае чаканне свята можа паменшыць радасць ад самога свята. Мне здаецца, было б лепш, калі б вуліцы заззялі ў канцы снежня, бліжэй да 24—25-га. Тады атмасфера свята ўспрымалася б як нешта яркае, незвычайнае. А цяпер усе гэтыя елкі здаюцца недарэчнымі. Недалёка ад майго дома ёлку паставілі і прыбралі больш чым за месяц да Новага года!



Яшчэ да пачатку снежня некаторыя ёлкі ў Мінску былі ўжо цалкам прыбраныя.

***Сяргей, 61 год, працуе на малаказаводзе:***

— Гэта проста маркетынг, каб павялічыць продажы. Ствараецца святочная абстаноўка, людзі ўспамінаюць, што трэба купляць падарункі. Невыпадкова першымі навагоднія ўпрыгожванні з'явіліся ў крамах і гандлёвых цэнтрах.

***Ірына, 22 гады, знаходзіцца ў адпачынку па доглядзе дзіцяці:***

— А я рада, што на вуліцах ужо адчуваецца набліжэнне Новага года. Жыццё ў мамы маленькага дзіцяці не занадта багатае падзеямі. Усё прывязана да рэжыму малога: пад'ём, прагулкі, кармленні. І ўсё гэта кожны дзень у пэўны час. Такі распарадак часам выклікае роспач. Таму, калі падчас прагулкі можна ўбачыць нешта святочнае і радаснае — напрыклад, як прыбіраюць ёлку на плошчы або навагоднее афармленне крамы, — гэта дадае пазітыву.

***Таццяна, 65 гадоў, пенсіянерка:***

— Добра, што ўпрыгожваюць горад! І не рана! Прыгажосці і свята шмат не бывае. Калі я была маленькай, Новаму году радаваліся ўсе — і дзеці, і дарослыя. Да гэтага часу памятаю пах свежай ігліцы. Ёлкі былі ў кожным доме. А цяпер ёлку многія нават не ставяць або штучную. У гады майго дзяцінства людзі ўпрыгожвалі і дамы, і вуліцы, як умелі. Размалёўвалі вокны, выразалі сняжынкі з паперы. А цяпер такая прыгажосць да Новага года на вуліцах ствараецца, а многія бурчаць. Проста, напэўна, людзі развучыліся радавацца. А няўменне радавацца простым рэчам робіць жыццё бяднейшым.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

---

Год гістарычнай памяці

# НЕ ЗАБЫЦЦА НІКОГА...

**Агляд экспазіцый па тэме генацыду беларускага народа праходзіць на базе ўстаноў адукацыі**



Фота edu.gov.by

Вынікам мерапрыемства стане стварэнне на сайтах устаноў адукацыі раздзела «Успомніць усё. Памятаць кожнага» са штодзённай актуалізацыяй інфармацыі аб праведзеных мерапрыемствах, абнаўленне музейных экспазіцый па генацыдзе беларускага народа; стварэнне часовай выстаўкі з разважаннем калектыўных і індывідуальных творчых работ навучэнцаў (вершы, эсэ, фатаграфіі, малюнкі, замалёўкі), арганізацыя выставак і іншых мерапрыемстваў, прысвечаных генацыду беларускага народа, у бібліятэках устаноў адукацыі.

Тэматычныя мерапрыемствы ва ўстановах адукацыі наведаюць работнікі пракуратуры, малалетнія вязні, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, навуковыя работнікі, вучоныя Нацыянальнай акадэміі навук.

Таксама арганізатары прапануюць з дапамогай інтэрактыўнай карты з указаннем месцаў здзейсніць маршруты шостага школьнага і выхаднога дзён па памятных мясцінах сталіцы і мясцінах, звязаных з генацыдам жыхароў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Як расказалі ў прэс-службе Міністэрства адукацыі, у сталічных установах адукацыі створаны школьныя музеі і музейныя экспазіцыі, прысвечаныя генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, дзе праводзяцца шматлікія мерапрыемствы і экскурсіі.

Так, выставачная экспазіцыя «А памяць аб гэтым жыве да гэтага часу», прысвечаная асноўным падзеям Вялікай Айчыннай вайны, пачала функцыянаваць з 1 верасня ў мінскай сярэдняй школе № 148. На дадзены момант яна складаецца з дзесяці стэндаў і двух вітрын і распавядае пра падзеі, якія адбываліся ў кожны год Вялікай Айчыннай вайны.

Асобныя стэнды адведзены генацыду беларускага народа ў гады вайны, партызанскаму руху на тэрыторыі Беларусі, героям вайны і дзецям — героям вайны.

На стэндах размешчаны QR-коды, пераходзячы па якіх можна азнаёміцца з дадатковай інфармацыяй аб паглядзецы відэаролік пра падзею або лёс чалавека, які зацікавіў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# БЕЗ МЕДЫКАЎ І ЛЕКАЎ



## Чым пагражае глабальны крызіс аховы здароўя?

**Работнікі псіхіятрычных аддзяленняў у Парыжы выйшлі на акцыю пратэсту з-за недахопу кадраў і сродкаў для лячэння пацыентаў. Маніфестацыя прайшла перад будынкам міністэрства аховы здароўя Францыі, паведаміла РІА «Навіны». Пратэстоўцы запатрабавалі ад улад выдзяляць больш сродкаў для лячэння пацыентаў і павялічыць колькасць медыцынскага персаналу. Па словах адной з удзельніц пратэсту, яна працуе ў галіне ўжо 20 гадоў і бачыць, як пагоршыліся ўмовы працы. У бальніцах становіцца менш персаналу, а таксама ўсё менш выдзяляюць сродкаў для забеспячэння прафесійнай дзейнасці. Асабліва складаная сітуацыя ў прыгарадах, адзначыла жанчына. Медыцынская галіна ў цяжкім становішчы ў шэрагу краін, у тым ліку тых, якія традыцыйна лічыліся заможнымі і ўзорнымі ў плане аказання меддапамогі. Чым жа пагражае глабальны крызіс аховы здароўя?**

### НЕДАСТУПНЫЯ ПАСЛУГІ

Зразумела, што сістэмны калапс аховы здароўя ўзнік не сёння. Крызісныя з'явы назіраліся задоўга да разгортвання пандэміі каранавіруса і глабальнай рэцэсіі. Пяць гадоў таму Сусветны банк сумесна з Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя правялі спецыяльнае даследаванне, якое паказала, што ўжо тады не менш за палову сусветнага насельніцтва не мела доступу да асноўных паслуг аховы здароўя. «Гэта проста недапушчальна», — заўважыў генеральны дырэктар Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Тэдрас Адханам Гебрэесус.

Крызісныя з'явы ахапілі і заможныя краіны. Так, у 2015-м вядомы брытанскі акцёр Рычард Боўнхіл памёр пасля таго, як з-за недахопу месцаў у шпіталі яму перанеслі планавую аперацыю на паўтара месяца. Прычым гэта не прыватны выпадак, яго можна лічыць тыповым для заходняй медыцыны, калі прыёму ў спецыяліста там часта даводзіцца чакаць ледзьве не гадамі. Штогод мноства сем'яў застаюцца за рысай беднасці, бо ім даводзіцца аплачваць медыцынскую дапамогу з уласных сродкаў. 800 мільёнаў чалавек выдаткоўвалі не менш чым 10 працэнтаў свайго сямейнага бюджэту на медыцынскую дапамогу для сябе, хворага дзіцяці або іншага члена сям'і.

Паводле ацэнкі Сусветнага банка і Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, на той час 100 мільёнаў чалавек штогод станавіліся жабракамі з-за «катастрафічна высокага кошту паслуг аховы здароўя». Толькі трэць беднага насельніцтва планеты атрымлівала сацыяльную дапамогу. «Калі мы нічога не зробім, то да 2030 года 167 мільёнаў дзяцей будуць жыць у крайняй галечы», — адзначыў тагачасны кіраўнік Сусветнага банка Джым Ён Кім. Кажучы аб пагрозах для чалавечага капіталу па ўсім свеце, ён заўважыў, што каля 155 мільёнаў дзяцей «адсталі ў развіцці і літаральна не змогуць нармальна вучыцца і зарабляць сабе на жыццё».

### СІСТЭМА Ў ПІКЕ

Што ж адбываецца цяпер? Вядучыя эксперты Сусветнага эканамічнага форуму (WEF) і кампаніі Deloitte прызнаюць нездавальняльны стан аховы здароўя ў свеце, што мае патрэбу ў сур'ёзных рэформах. Даступнасць медыцынскай дапамогі зніжалася і да пандэміі. А ковідны крызіс стварыў пагрозу для многіх краін, дзе вялікія пласты грамадства былі фактычна адлучаны ад аховы здароўя. «Глабальная сістэма аховы здароўя пагаршаецца ўжо на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. З недахопам ложкаў, доўгімі спісамі чакання, выдаткамі, якія павялічваюцца, і ўплывам пандэміі стан глабальнай сістэмы аховы здароўя яшчэ ніколі не быў такі складаны. Прычым для ўсіх яе ўдзельнікаў: ад пацыентаў да ўрачоў і іншых пастаўшчыкоў медыцынскіх паслуг», — адзначаецца ў матэрыяле WEF.

Згодна з высновамі кансалтынгавай кампаніі Deloitte, ахова здароўя па ўсім свеце знаходзіцца сёння на пераломным этапе. Супярэчнасці і неабходнасць змен у ахове здароўя збіраліся многія гады, але пандэмія COVID-19 ужо ператварае снежны ком праблем у сапраўдную лавіну. Відавочна, што змяненні неабходныя па ўсім свеце. Работнікі аховы здароўя адчуваюць сёння эмацыянальны, фізічны і прафесійны стрэс. У ЗША каля 55 працэнтаў медработнікаў паведамляюць аб выгаранні, прычым самы высокі паказчык (69 працэнтаў) — сярод самага маладога персаналу, нагадвае Deloitte.

Пандэмія таксама абумовіла скарачэнне доступу да медыцынскай дапамогі, не злучанай з COVID-19. Пацыенты адкладаюць або адмаўляюцца ад шырокага спектра паслуг, у іх ліку — экстраннае лячэнне вострых станаў, планавыя агляды і рэкамендаваныя скрынінгі на рак. Доўгатэрміновыя наступствы для здароўя ад няздольнасці ўмяшацца на ранняй стадыі, ад адсутнасці лячэння хранічных захворванняў і недыягнаставаных станаў будуць значнымі, папярэджваюць заходнія эксперты. «Пандэмія пагоршыла стан і без таго разбуранай галіны аховы здароўя, чаму спрыялі дзесяцігоддзі неэфектыўнасці, скарачэнне фінансавання, няўдалая рэфармацыя», — адзначаюць эксперты Сусветнага эканамічнага форуму.

### БРЫТАНЦЫ ЭКАНОМЯЦЬ НА ЗДАРОЎІ

Мільёны брытанцаў могуць сутыкнуцца з «крызісам аховы здароўя» цяперашняй зімой з-за высокіх рахункаў за электраэнергію і эканоміі на ежы на фоне росту цэн. Пра гэта паведаміла газета Financial Times. Брытанцы вымушаны эканоміць на здароўі. «Каля 24 працэнтаў хатніх гаспадарак Вялікабрытаніі купляюць менш прадуктаў, а кожны дзясяты брытанец есць ежу халоднай, каб знізіць спажыванне электраэнергіі», — прыводзіць выданне звесткі апытання даследчай кампаніі YouGov. Акрамя таго, паводле слоў прадстаўніка дабрачыннай арганізацыі National Energy Action Адама Скорэра, скарачэнне прыёму медыкаментаў, прадуктаў харчавання і спажывання электраэнергіі ў выніку павышэння цэн на энергарэсурсы цяжка адбіваецца на здароўі брытанцаў. Ён папярэдзіў, што ў найбліжэйшыя месяцы краіна сутыкнецца з крызісам аховы здароўя. Выданне таксама паведамляе, што дабрачынныя арганізацыі краіны заклікаюць урад Брытаніі аказаць падтрымку хатнім гаспадаркам, а энергетычныя кампаніі — увесці субсідаваны сацыяльны тарыф на энергію для бедных пластоў насельніцтва.

Вялікабрытанія штогод выдаткоўвае на ахову здароўя прыкладна на 20 працэнтаў сродкаў менш, чым дзяржавы Еўрасаюза, паведаміла Financial Times. Згодна з даследаваннем Фонду аховы здароўя (Health Foundation) Злучанага Каралеўства, краіна за дзесяцігоддзе павінна павялічыць фінансаванне сферы на £40 млрд (прыкладна $47,6 млрд) у год, каб зраўняцца з вядучымі еўрапейскімі дзяржавамі, такімі як Германія і Францыя. Брытанская Нацыянальная служба аховы здароўя (National Health Service, NHS), паводле звестак выдання, сутыкаецца з сур'ёзным крызісам фінансавання, у тым ліку з-за росту інфляцыі і недахопу працоўнай сілы. Эксперты мяркуюць, што NHS з цяжкасцю выконвае пастаўленыя задачы і не спраўляецца з лячэннем вялікай колькасці пацыентаў. Крызіс аховы здароўя, паводле даных фонду, выклікае «скарачэнне выжывальнасці» пры некаторых захворваннях.



На фоне эканамічных праблем медсёстры Злучанага Каралеўства Нацыянальнай службы аховы здароўя (NHS) збіраюцца зладзіць першы агульнанацыянальны пратэст. Іх акцыя, асноўным патрабаваннем якой з'яўляецца павышэнне заработнай платы, пагражае дадатковымі збоямі і без таго перагружанай сістэме аховы здароўя. «Сотні тысяч медсясцёр выступілі і сказалі: «З нас хопіць». Іх гнеў ператварыўся ў дзеянне. І па ўсёй Вялікабрытаніі, ва ўсіх частках NHS, мы ўбачым забастоўку. І гэтых медсясцёр прымусілі пайсці на гэты крок», — адзначыў кіраўнік Каралеўскага каледжа медсясцёр Пэт Кален. Страйкі пройдуць у Англіі, Уэльсе і Паўночнай Ірландыі 15 і 20 снежня.

Прыцягненне ваеннаслужачых узброеных сіл Вялікабрытаніі да ваджэння машын хуткай дапамогі і разгортванне ваенных шпіталяў плануецца на выпадак масавай забастоўкі медработнікаў у снежні, перадае Sky News. Такое разгортванне прадугледжваецца ў адпаведнасці з планамі дзеянняў у надзвычайных сітуацыях. Агенцтва паведамляе, што чыноўнікі аховы здароўя і абароны распрацоўваюць стратэгію на выпадак непрадбачаных абставінаў, паколькі кіроўцы хуткай дапамогі і парамедыкі разглядаюць магчымасць далучыцца да медсясцёр на лініях пікетаў у найбліжэйшыя месяцы.

### ХВАЛЯ ПРАТЭСТАЎ

Энергетычны крызіс у Германіі можа стаць прычынай закрыцця бальніц у краіне. Такую заяву міністра аховы здароўя Германіі Карла Лаўтэрбаха прывёў ТАСС, спасылаючыся на тэлевізійны канал ARD. Яшчэ адной прычынай такога развіцця падзей кіраўнік профільнага ведамства назваў высокі тэмп інфляцыі ў краіне. Карл Лаўтэрбах адзначыў, што калі рэакцыя на цяперашнюю сітуацыю не будзе дастаткова рашучай, то ліквідацыя медыцынскіх стацыянараў стане непазбежнай. Усяго, паводле інфармацыі ведамства, у Германіі працуе каля 1,9 тысячы бальніц, іх ложкавы фонд — 490 тысяч.

Супрацоўнікі дзяржаўных бальніц страйкуюць у Грэцыі. На акцыю пратэсту ў цэнтры Афін выйшлі сотні медыкаў, незадаволеных умовамі працы. Прафсаюзы сцвярджаюць, што рашэнні ўрада пагаршаюць і без таго сур'ёзны недахоп персаналу, што прыводзіць да доўгіх працоўных змен і парушае правы супрацоўнікаў. Медыкі таксама патрабуюць, каб іх уключылі ў спіс удзельнікаў прафесій, якім належаць дадатковыя выплаты за цяжкую і шкодную для здароўя працу. «Мы выйшлі на вуліцу і праводзім стачку, таму што ўлады ператварылі нас з герояў у казлоў адпушчэння».

Крызіс у сістэме аховы здароўя вывеў на вуліцы іспанскіх медыкаў. Чарговая акцыя пратэсту прайшла ў Мадрыдзе. Медработнікі патрабуюць павышэння заработнай платы, павелічэння фінансавання сферы і паляпшэння ўмоў працы. Па іх словах, нагрузка на спецыялістаў вырасла ў разы. У некаторых клініках на аднаго педыятра прыпадае чатыры тысячы дзяцей. Медыкі не першы раз спрабуюць абараніць свае інтарэсы. Самы масавы пратэсны марш у лістападзе сабраў у іспанскай сталіцы каля 650 тысяч удзельнікаў.

У Аргенціне прайшлі акцыі пратэсту медыкаў. У Буэнас-Айрэсе тысячы чалавек сабраліся каля Міністэрства аховы здароўя, патрабуючы павышэння зарплаты, бо на цяперашнюю пры сённяшняй эканамічнай сітуацыі вельмі цяжка выжыць. Яшчэ адным патрабаваннем пратэстоўцаў стала павелічэнне фінансавання галіны. Стан бальніц, па меркаванні медыкаў, вымушае жадаць лепшага, а ўмовы працы ў іх проста жудасныя. Крызіс у ахове здароўя ў найбліжэйшы час можа яшчэ больш узмацніцца з-за недахопу ўрачоў. Колькасць ахвотных вучыцца на медыцынскіх факультэтах імкліва скарачаецца з-за нізкіх заробкаў і вялікай нагрузкі.

Эканамічныя страты ў паўднёвай зоне Гандураса з-за пратэснай акцыі на Панамерыканскай шашы медыцынскіх работнікаў вылічаюцца мільёнамі, заявіў выканаўчы дырэктар Нацыянальнай асацыяцыі фермераў аквакультуры Гандураса Хаўер Амадор, паведаміла Hondudiario. Ён заклікаў улады Міністэрства аховы здароўя выплаціць запазычанасць па заработнай плаце персаналу бальніцы Сан-Ларэнца. Хаўер Амадор папярэдзіў, што калі гэтыя пратэсныя акцыі будуць працягвацца, то эканамічныя страты ўзрастуць.

Улады Нігерыі паабяцалі перагледзець структуру аплаты працы ўрачоў. Гэта абяцанне ў абмен на адмову іх ад забастовак даў міністр працы і занятасці краіны Крыс Нгіге, паведамляе выданне Premium Times. Нгіге сустрэўся з новым кіраўніцтвам Медыцынскай асацыяцыі Нігерыі (NMA). Ён заявіў, што ўрад мае намер перагледзець структуру аплаты працы не толькі ўрачоў, але і іншых катэгорый медработнікаў, у тым ліку фармацэўтаў, медсясцёр, супрацоўнікаў медыцынскіх лабараторый. Ён адзначыў, што структура аплаты працы ў медыцыне павінна была быць скарэкціравана яшчэ ў 2014 годзе, але ўрад не змог гэтага зрабіць. У выніку ўрачы і іншыя медработнікі не раз спынялі сваю работу. «Дрэнны стан эканомікі не азначае, што лекары ці іншыя медыцынскія работнікі не павінны атрымліваць годную заработную плату», — заявіў ён.

Французская газета Le Parisien паведаміла аб узнікненні фармацэўтычнага крызісу ў ЕС. Высветлілася, што з паліц еўрапейскіх аптэк імкліва знікаюць лекі і медыцынскія прэпараты. Прычым гаворка ідзе не пра дэфіцытныя тавары, якія карыстаюцца абмежаваным попытам і рэалізуюцца па рэцэптах урачоў, а пра самыя базавыя лекі, якія павінны прадавацца без абмежаванняў, накшталт парацэтамолу і антыбіётыкаў.

Швейцарскія ўлады былі вымушаны апублікаваць спіс прэпаратаў, якія знаходзяцца ў дэфіцыце. Нечакана сярод дэфіцытнага апынуўся вельмі папулярны і шырока распаўсюджаны раней ібупрафен. Французскія ўлады ўзялі прыклад са швейцарцаў і таксама прызналі дэфіцытнымі 85 лекаў, у тым ліку парацэтамол, розныя антыбіётыкі і нават антысептычнае мыла. Нацыянальнае лекавае агенцтва Францыі заклікала рознічныя сеткі абмежаваць продаж прэпарату эфералган, які стаў дэфіцытным і выпрацоўваецца ў самой Францыі. Адметна, што дэфіцыт лекаў адзначаецца не толькі ў Еўропе, але і ў ЗША і Канадзе.

**Захар БУРАК.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ КОНФИСКОВАННОГО ИМУЩЕСТВА

## 27 декабря 2022 года

| № лота | Наименование и местонахождение недвижимого имущества | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок с кадастровым номером 422084000019000028. Общая площадь 0,0800 га. Целевое назначение – земельный участок для коллективного садоводства. Местонахождение недвижимого имущества: Гродненская область, Гродненский район, Квасовский сельсовет, СТ «Гарант», д. 348 | 2 544,00 | 254,00 |
| 2 | Капитальное строение с инвентарным номером 412/С-25038 (наименование – жилой дом). Местонахождение недвижимого имущества: Гродненская область, Мостовский район, Куриловичский с/с, д. Стукалы, ул. Кольцевая, д. 4 | 496,80 | 49,00 |

Лоты продаются по поручению управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, тел.: (0152) 626055, 626056.

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10 %.

Условия продажи отсутствуют.

Уполномоченный орган и хранитель недвижимого имущества предоставляют возможность предварительно ознакомиться с недвижимым имуществом.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в Гродненском областном управлении № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, установленные организатором аукциона и указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. По письменному указанию подразделения Департамента недвижимое имущество может быть снято с аукциона организатором аукциона в любое время до объявления его проданным.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Аукцион состоится 27 декабря 2022 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал**.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **с 1 декабря по 21 декабря 2022 года.**

Телефоны для справок в Гродно: (0152) 626055, 626056.

Адреса сайтов: Государственного комитета по имуществу **http://gki.gov.by,** Гродненского городского исполнительного комитета **http://grodno.gov.by,** коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» **http://gcn.by**

---

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by |
| **Продавец** | ОАО «Сбер Банк», 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 32А-1 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by |
| **Предмет электронных торгов<br>Имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Пушкина, 172** | |
| **1. Здание банка** (здание нежилое) общей площадью 2124,2 кв. м, инвентарный номер 710/С-52251. Составные части и принадлежности: подвал. **Обременение: аренда.**<br>**2. Помещение гаражей** (помещение транспортного назначения), общей площадью 41,6 кв. м, инв. номер 710/D-54201.<br>**3. Складское помещение** (складское помещение) общей площадью 41,3 кв. м, инв. номер 710/D-54202.<br>**4. Тепловая сеть** (сооружение специализированное энергетики), протяженностью 71,2 кв. м, инв. номер 710/С-73150, по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Пушкина, тепловая сеть по ул. Пушкина, ул. К. Либкнехта от ТК-1005/1 до ТК-1005 | |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 741000000006001659:** предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания Первомайского отделения ОАО «Белпромстройбанк» в г. Бобруйске общей площадью 0,2969 га | |
| **Дополнительная информация:** при приобретении предмета аукциона победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона на сумму **89 437,70 белорусского рубля с НДС 20 %.**<br>Состав имущества и цены размещены на сайте организатора аукциона www.cpo.by и www.ipmtorgi.by | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **1 869 197,99 белорусского рубля** |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»** | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** не более 90 дней со дня заключения договора купли-продажи | |
| **Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,5 %** от цены продажи лота | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 22.10.2022 г. | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **10.01.2023 г.** в 10.00 по 12.00.<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **09.01.2023** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (44) 704-92-06.<br>E-mail: auction@cpo.by** |

---

## О СОЗЫВЕ СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Слуцк-Модуль»

Собрание состоится **03 января 2023 года в 10.00** по адресу: **223610, Минская обл., г. Слуцк, ул. 14 Партизан, д. 101.**

Телефон для справок А1 (8-044) 72 35 122.

УНП 600074992

---

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
